Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА

БЕЛАРУСІ

Б20136

№ 29
1933 г.

Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў

Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б)

У сувязі з запытаннямі паасобных калгасаў і калгаснікаў, СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) растлумачваюць:

Пастановай СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) ад 2-VIII—33 г. „Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў і размеркаванні збожжа паміж калгаснікамі па працаднёх", забаронена савецкім і партыйным арганізацыям сваімі распараджэннямі ствараць у калгасах дадатковыя фонды і тым самым змяншаць колькасьць збожжа, якое належыць размеркаванню паміж калгаснікамі па працаднёх. Гэтай пастановай забяспечваецца права саміх калгаснікаў вольна распараджацца астачамі збожжа ў калгасах пасля выканання калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і пасля засыпкі абавязковых фондаў насенных, страхавых і фуражных.

Пацвярджаючы да няўхільнага выканання забарону савецкім і партыйным арганізацыям ствараць зверху іншыя фонды акрамя ўказаных у пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б), ад 2-VIII—33 г. (насенных, страхавых і фуражных) СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) растлумачваюць, што, калі самі калгасы пажадаюць, яны маюць права пастановай агульнага сходу калгасу, з удзелам ня менш двух трэцяй калгаснікаў, ствараць і іншыя фонды ў калгасах, як-то: фонд на павялічэньне непадзельных капіталаў у калгасах, а таксама фонд для аказання дапамогі інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў, на ўтрыманне дзіцячых ясляў.

Старшыня СНК Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

Павышэнне расцэнак на ручное цярабленне ільна

У мэтах стымулявання хутчэйшага сканчэння ўборкі ільна і павышэння якасці працы Наркамзем дазволіў калгасам павысіць расцэнкі работы ў працаднёх калгаснікам і калгасніцам, якія працуюць на ручным цярабленні ільна.

За выкананне дзённай нормы выпрацоўкі з аднаразовым абавязковым сартаваннем ільносаломы калгас мае права налічыць 1,75 працадні замест устаноўленай раней расцэнкі 1,50 працадня.

(БЕЛТА).

Змагацца за ганаровае месца на ўсесаюзнай фінансавай чырвонай дошцы

Вельмі марудна праходзіць мабілізацыя сродкаў па БССР у трэцім квартале. Самым адсталым вучасткам у фінансавай рабоце з'яўляецца рэалізацыя пазыкі і асабліва па аднаасобным сэктары.

БССР адстае таксама і па паступленні ўзносаў. На 20-е жніўня недапаступіла па падпісцы 5.091 тысяч рублёў.

Падпісаны тав. Гікало і іншымі прадстаўнікамі партыі і ўраду БССР усесаюзны соцдагавор на датэрміновае выкананне фінплана III квартала, ударніцы фінфронта павінны зрабіць праграмай бальшавіцкай барацьбы за мабілізацыю сродкаў.

Усесаюзнае спаборніцтва ставіць перад жаночым актывам Беларусі велізарныя задачы. Неабходна разгарнуць шырока соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж дэлегаткамі, работніцамі, калгасніцамі і працоўнымі аднаасобніцамі на выкананне фінплана III квартала. Галоўную ўвагу зараз трэба звярнуць на паступленне чарговых узносаў па пазыцы імя 2-й пяцігодкі, якія складаюць каля аднэй трэці ўсяго фінансавага плана.

Разгарнуць масавую кампанію за датэрміновыя ўзносы калгасамі, калгаснікамі і працоўнымі аднаасобнікамі ўсіх плацяжоў, якія з іх прылічваюцца.

Кожная актывістка—дэлегатка, работніца, калгасніца, працоўная аднаасобніца, хатняя гаспадыня—павінна быць ударніцай фінфронта.

Выканаем план мабілізацыі сродкаў III квартала, заваюем ганаровае месца на ўсесаюзнай фінансавай чырвонай дошцы.

К.

УДАРНІЦА ФІНФРОНТА

Бернатовіч Аміля поўнасцю ўнесла грошы па сваёй падпісцы на пазыку. Убачыўшы, што так паступіла калгасніца, якая мае больш за 50 год, калгаснікі—70 гадовы Жноцкі, Жыглер і Бернатовіч Іван, а за імі калгасніцы-ўдовы Туміловіч Вера і Юля ўнеслі першы ўзнос па 7 руб.

Усяго па калгасу „Чырвоны пагранічнік" унесена 300 руб., а па ўсяму Магільнянскаму сельсавету—2210 руб.

Усе жанчыны павінны ўзяць прыклад з Бернатовіч Амілі і арганізаваць датэрміновую выплату па пазыцы „другой пяцігодкі".

Ю. С.

Уздзенскі раён.

Г. Н. Б-ка Ст. Ак.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ № 29 верасень 1933 г.

Арганізуем усебеларускае спаборніцтва на лепшую работу па жывёлагадоўлі

З адозвы калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі „Свабода". Дзяржынскага раёну

Да ўсіх калгаснікаў БССР

Наша савецкая краіна, пад кіраўніцтвам ленінскай артыі і яе правадыра тав. Сталіна, з небывалым уздымам змагаецца за далейшыя перамогі соцыялістычнай будоўлі. Шырацца перадавыя калоны барацьбітоў за высокі ураджай, за ўборку без страт, за датэрміновую пастаўку збожжа дзяржаве.

Тысячы, дзесяткі тысяч дабрасумленных калгаснікаў ужо ў гэтым годзе выходзяць на светлы шлях радаснага, культурнага, заможнага жыцця.

Высокі ўраджай адкрывае перад калгасамі велізарныя магчымасці у справе развіцця жывёлагадоўлі.

БССР і Заходняй вобласці, з якой мы спаборнічаем, безумоўна пад сілу ўжо у гэтым годзе не толькі дабіцца рашучага ўмацавання і роста жывёлагадоўчых калгасных ферм, але і поўнай ліквідацыі бескароўнасці асобных калгаснікаў.

Зараз, калі на гумны звозяцца апошнія снапы, калі на такох гудуць малатарні, а сілосныя ямы і вежы напаўняюцца зялёным сакавітым кормам і ідзе барацьба за кармавую базу для жывёлагадоўлі, трэба высока ўзняць сцяг сацыялістычнага спаборніцтва за лепшую калгасную ферму, за рэзкае павышэнне ўдояў, захаванне маладняка, знішчэнне ялавасці і падрыхтоўку стада да зімы.

У нашым калгасе „Свабода", Дзяржынскага раёну, Негарэльскага сельсавета, які знаходзіцца на мяжы з капіталістычным светам, мы ўжо дабіліся пэўных поспехаў у жывёлагадоўлі.

Наша ферма зараз адна з першых у раёне па сваіх вытворчых паказальніках. На 1 студзеня 1933 года на ферме было 87 свіней, у тым ліку 32 маткі, тры з якіх мы забракавалі. 27 матак, якія апарасіліся, прывялі 174 парасят. Спачатку года пала 13 парасят, што складае 7 проц. адыхода. На кожны апарос прыпадае 6,6 дзелавых парасят. Не гледзячы на тое, што свіні нашы мясцовай пароды, усё-ж парасяты ў двухмесячным узросце пры адыманні важаць ня менш 10—12 *кгр.* У саўгасе „Блонь" мы набылі двух маладых кныроў ангельскай пароды і паляпшаем сваё стада.

Цяпер мы маем 155 свіней, у тым ліку 34 маткі, апрача таго 26 свіней мы здалі дзяржаве, 18 прадалі на калгасным рынку, а 13 парасят выдалі ў якасьці прэміі лепшым свінаром і калгаснікам-ударнікам.

На працягу верасня ў нас павінна парасіцца 19 матак, ад якіх мы спадзяемся атрымаць не менш 114 дзелавых парасят. Да канца года мы будзем мець 269 галоў, або на 13 больш, чым прадугледжана вытворчым заданнем.

Паводле плана на 1 студзеня 1934 года мы павінны пакінуць на ферме 145 свіней, у тым ліку 40 свінаматак. Такім чынам 124 свіні застаюцца ў распараджэнні калгаса.

Што мы з імі будзем рабіць?

80 свіней мы прадамо іншым калгасам нашага раёну для камплектавання ферм, 30 прадамо на мяса, а 14 парасят ад асенніх апаросаў мы аддамо ў якасці прэміі свінаром і прадамо калгаснікам-ударнікам.

У гэтым годзе ферма дасць нам значны прыбытак—у тры з паловай разы больш, чым летась. 75 проц. грашовых прыбыткаў калгаса гэта ад фермы. Толькі адна свінагадоўчая ферма дасць не менш рубля на працадзень.

Свае абавязкі перад дзяржавай мы выконваем у тэрмін. 15-месячны план мясазагатовак выкананы на 85 проц. Датэрмінова і поўнасцю мы здалі дзяржаве сена. Выкананы гадавы план па жыце і ячменю. Разлічыліся з дзяржавай і за работу МТС. На загатоўчы пункт завезена 97 цэнтн. жыта і 15 цэнтн. ячменю.

Адстаем мы са здачай малака. Замест 7.380 літраў на 1 верасня здадзена 6.380. У выдаткаванні малака не было ўліку. Зараз гэта справа наладжана. За верасень запазычанасць па малаку будзе канчаткова ліквідавана.

Растуць і нашы даходы. Мы падлічылі: летась на працадзень калгаснік атрымаў 1,8 *кгр* збожжа і 1,5 *кгр* зульбы. У гэтым годзе на працадзень прыпадае 3,4 кгбожжа і 5 *кгр* бульбы. Сена і саломы ў 1932 г. выдавалася на працадзень два *кгр*, а ў гэтым годзе—6 *кгр*, прошай на працадзень летась было 15 кап., сёлета будзе 1 руб 7 кап. улічваючы даходы ад свінафермы.

Гэтыя лічбы гавораць, што заможнасць у нашым калгасе не аддаленая будучыня, а рэальная і блізкая магчымасць.

Зараз больш за ўсё нас клапоціць захаванне верасневых апаросаў, забеспячэнне кармамі стада на ўвесь год і падрыхтоўка яго да зімы.

Усім вядома, што з-за адсутнасьці належнага ўліку і зберажэння, летась у нас не хапіла кармоў. Кармы разбазарваліся і расцягваліся. З восені давалі колькі улезе, а потым не было чым карміць свінней. Цяпер мы рашылі выдаткоўваць кармы паводле памесячнага кармавога плана. Кармы па актах будуць пераданы загадчыкам фермы пад іх асабістую адказнасць. Свінагадоўчай ферме, пад адказнасць загадчыка Нарвыша мы перадалі 33 цэнтн. добрай канюшыны, а зараз вылучаем 350 цэнтн. бульбы. Пад штучныя выпасы для свінней вылучаем 20 га, на якіх ужо засеяна 5 га канюшыны.

Наступная наша задача падрыхтаваць свінарнік. Апаросы пачаліся. 3-га верасня нарадзілася ужо 8 парасят. Важна не толькі захаваць іх, але і забяспечыць ім нармальнае разьвіцьцё. Да 1 кастрычніка нам засталося пакрыць у свінарніку падлогу цэмантам, зрабіць столь, паправіць шыбы. Каб захоўваць у свінарніку належную тэмпературу, мы рашылі перабудаваць печы і ўставіць падвойныя рамы, забіць і заканапаціць лазы, а дзверы абіць войлакам. Тады у свінарніку будзе і цёпла і суха. Перад зімоўкай мы зробім дэзынфекцыю—пабелім станкі вапнай.

Важнейшай нашай задачай, ад вырашэння якой залежыць далейшы рост фермы, з'яўляецца падрыхтоўка стада да асення-зімовай злучнай кампаніі. За тры тыдні да злучкі мы ўзмацняем кармавы рацыён маток і кныроў з тым, каб у 1934 годзе мець па два апаросы ад маткі.

Каб яшчэ больш разгарнуць жывёлагадоўлю ў нашым калгасе, мы выбіраем інспекцыю па якасці, якая перыядычна будзе правяраць работу жывёлагадоўчых ферм, кожныя два месяцы узважваць парасят, правяраць іх прырост і выдаткаваньне кармоў. Не менш двух разоў у месяц—склікаць вытворчыя нарады работнікаў фермы, на якіх заслухоўваць справаздачу загадчыка.

Наша задача—выйсці з спаборніцтва з 9 дзелавымі парасятамі на матку, атрымаць у гэтым годзе ад 32 матак 288 парасят. Для павышэння кваліфікацыі свінароў мы арганізуем агратэхнічны гурток, выпісваем спэцыяльную літаратуру.

У нас не будзе бескароўных. Разам з разгортваннем калгаснай жывёлагадоўлі мы не забываемся і пра забеспячэнне каровамі калгаснікаў. У нас усяго 5 бескароўных—Кісель Уладзімер, Доўнар Казімір, Варакса Пятрусь, Маскалюк Ідаля і Зубовіч Фабіяна. Усе яны былыя беднякі, раней кароў не мелі, самі набыць іх не маглі. Пастанову партыі і ўраду аб дапамозе бескароўным сустрэлі з вялікай радасцю. Праўленне калгаса пастанавіла дапамагчы бескароўным набыць цёлак.

Канчаючы наш ліст да ўсіх калгаснікаў БССР і Заходняй вобласці, мы падкрэсліваем, што выкананне пастаўленай перад намі партыяй і ўрадам задачы—патроіць у будучым годзе прадукцыю жывёлагадоўлі, даць дзяржаве больш мяса, малака, воўны—залежыць выключна ад нас самых.

Мы горача вітаем ініцыятыву калгаснікаў—ударнікаў Татарыі і Сярэдняй Волгі і Днепрапятроўшчыны аб разгортванні усесаюзнага спаборніцтва на лепшую работу па жывёлагадоўлі.

Мы далучаемся да выкліку калгаснікаў—ударнікаў Татарыі, Сярэдняй Волгі і Днепрапятроўшчыны і заклікаем усіх калгаснікаў БССР і Заходняй вобласці так паставіць работу па жывёлагадоўлі, каб заваяваць пяршынство ва ўсесаюзным соцыялістычным спаборніцтве.

Мы заклікаем усе калгасы БССР і Заходняй вобласьці паследаваць нашаму прыкладу і шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва за павялічэнне стада, за высокія ўдоі, сваечасовую здачу прадукцыі дзяржаве, лепшую падрыхтоўку да зімы і дапамогу калгаснікам у набыцці жывёлы.

Наперад да новых перамог у соцыялістычнай жывёлагадоўлі!

Няхай жыве наша родная комуністычная партыя і яе правадыр т. Сталін!

Па даручэнні агульнага сходу падпісалі:

калгаснікі с.-г. арцелі „Свабода" Дзяржынск. раёну.

ГПБ Ст.-Ак.

28 лепшых ударніц—у старшыні сельсаветаў

„Жанчыны ў калгасах—вялікая сіла. Трымаць гэту сілу пад спудам, значыць дапусціць злачынства. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб высоўваць наперад жанчын у калгасах і пусціць гэту сілу ў справу" (Сталін).

У ажыццяўленне ўказанняў правадыра партыі тав. Сталіна на І-м Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў аб вылучэнні жанчын-калгасніц на адказную работу па БССР разгарнулася шырокая работа.

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б у большасці раёнаў праведзены курсы жанчын-старшынь калгасаў. Значная колькасць гэтых жанчын вылучана ўжо на работу старшынямі калгасаў (па Сенненскім раёне—10 чалавек, па Мсціслаўскім—7, па Барысаўскім—6).

Асабліва вялікім дасягненнем у справе вылучэння жанчын калгасніц на адказную работу з'яўляецца выпуск праведзеных ЦВК БССР усебеларускіх курсаў жанчын-старшынь сельсаветаў.

Гэтыя курсы скончылі 84 жанчыны, палова з якіх—радавыя калгасніцы.

3-х месячная ўпартая работа выкладчыкаў і курсантак, шырока разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшую вучобу дало курсанткам за гэты кароткі тэрмін асноўныя веды, якія неабходны кожнаму кіраўніку сельсавета.

У выніку падрабязнага вывучэння кожнай курсанткі было праведзена размеркаванне скончыўшых на розныя работы. Трох курсантак вылучылі інструктарамі РВК па жанработе; 28 чалавек—старшынямі сельсаветаў, 8—намеснікамі старшынь, 32 сакратарамі і 13 пакінуты на рабоце ў калгасах, як сельсавецкі актыў.

Гутарка сакратара РК Раманенка з жанчынамі, якія скончылі курсы старшынь калгасаў (Мсціслаўскі раён).

Па ўсёй БССР да гэтага часу працавала ўсяго 32 жанчыны—старшынь сельсаветаў. Цяпер гэта лічба амаль падвоілася, што мае вялізарнае значэнне.

Задача райкомаў і райвыканкомаў—дабіцца замацавання гэтага новага актыву, дапамагаючы яму ў рабоце шляхам штодзеннага аператыўнага кіраўніцтва яго работай.

Перад ад'ездам на работу курсанткі абвясцілі сябе ўдарніцамі на рабоце ў сельсаветах і райвыканкомах і ўзялі на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Не пазней 2-х дзённага тэрміну арганізаваць увесь сельсавецкі актыў на праверку выканання калгасамі і аднаасобным сектарам абавязкаў перад дзяржавай па здачы сельскагаспадарчай прадукцыі, скончэння ўборачнай кампаніі і сяўбы азімых, а ў выпадку няпоўнага выкачання гэтых абавязкаў—мабілізаваць увагу ўсіх працоўных на сапраўднае і няўхільнае выкананне іх ва ўстаноўленыя тэрміны.

2. Разгарнуць арганізацыйную і масавую работу, як сярод калгаснага актыву, так і сярод аднаасобнікаў, і на працягу 1—2 месяцаў выявіць усіх сапраўды адданых і праверэных на рабоце ў вытворчасці рабочых МТС, саўгасаў і ўдарнікаў-калгаснікаў, уцягнуўшы іх у работу секцый і дэпутацкіх груп. Асаблівую ўвагу звярнуць на ўцягненне ў гэтыя масавыя органы працоўных жанчын. Кожная курсантка вярбуе ў секцыі сельсавета і дэпутацкія групы не менш 7-мі працоўных жанчын.

3. З першых-жа дзён работы ў сельсавеце і калгасе ўсім курсанткам распланаваць сваю работу так, каб кожны дзень вылучыць 1—2 гадзіны для павышэння свайго ўзроўню, як у галіне палітычных, так і гаспадарчых ведаў, паклаўшы ў аснову практыкаваны на курсах мэтад самастойнай распрацоўкі, а таксама выпіску і рэгулярную чытку газет „Правда", „Звязда" і часопісяй „Работніца і калгасніца Беларусі" „Власть советов" і „Раённы друк".

4. Наладзіць работу секцый і дэпутацкіх груп так, каб забяспечыць практычную дапамогу іх калгасам і саўгасам у скончэнні ўборачнай і сяўбы азімых. Там, дзе гэтыя масавыя органы не арганізаваны, не пазней 1-га кастрычніка арганізаваць і наладзіць іх работу.

5. Кожнай курсантцы, якая працуе ў сельсавеце на адказнай кіруючай рабоце, да 1-га студзеня 1934 году падрыхтаваць сабе намесніка—жанчыну з сельсавецкага актыву, адказваючы за яе практычны вопыт работы і адпаведную тэарэтычную падрыхтоўку. Не пазней 15-га верасня падабраць з лепшых актывістак—ударніц калгасніц адпаведныя кандыдатуры для пасылкі на аднагадовыя курсы пры аддзеле кадраў ЦВК БССР, на 3-х месячныя курсы і ў Магілеўскую сувпартшколу. Спіс вылучаных таварышоў прыслаць аддзелу кадраў прэзыдыуму ЦВК БССР да 20 верасня гэтага году.

6. Узгадніць з мясцовымі парт'ячэйкамі і палітаддзеламі МТС і пры кожнай дэпутацкай групе арганізаваць гурткі па вывучэнню агратэхнікі, трактара і складаных сельскагаспадарчых машын, уцягнуўшы ў гэтую справу ў першую чаргу ўвесь сельсавецкі жаночы актыў і спецыялістаў МТС і саўгасаў.

7. Праз ажыўленне дзейнасці бытавых секцый пры сельсаветах, не пазней 20 верасня арганізаваць праверку работы ясельных устаноў, вынесшы вынікі гэтай праверкі на шырокае абмеркаванне сходаў жанчын.

„Ужо мы, большэвікі, пастараемся, каб усе калгаснікі мелі ў нас па карове“ (Сталін)

Шынкевіч—лепшая ўдарніца калгаса „Чарвякова“ Мсціслаўскага раёна, атрымала карову.

Брыгада калгаснікаў к-са „Чарвякова“, Мсціслаўскага р., распрацоўвае пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным калгаснікам

У адказ на клопаты аб нас дзяржавы—яшчэ больш ударна будзем працаваць

З вялікім уздымам сустрэлі калгасніцы і калгаснікі калгаса „Свабода“, Старасельскага сельсавета, пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным калгаснікам у набыцці кароў.

Шмат ёсць бескароўных у гэтым калгасе.

Шалупенка Соня ў час абмеркавання пастановы заявіла, што калі яна была на злёце калгаснікаў, то там шмат гаварылі аб тым, што партыя паставіла сабе мэтай зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Увесь час думала яна аб тым, як гэта можна дабіцца таго, каб стаць заможнай. Старалася ўвесь час працаваць па-ударнаму, не рабіла ніводнага прагула. Зараз жа, калі ўбачыла, што ўрад і партыя так дапамагаюць бескароўным, аб іх клапоцяцца, то ў яе з'явілася вельмі вялікае жаданне яшчэ больш і лепш працаваць.

58-гадовая калгасніца **Кудзянова**, былая батрачка, кажа: „усё жыццё працавала на паноў, кулакоў і ніколі не мела сваёй каровы. З 1919 г. я ў калгасе. Проста самой мне не верыцца, што змагу я цяпер, з дапамогай партыі і ўраду, набыць карову“.

Г—н.

Віцебскі р.

Ударніца Міснік Прасіня атрымае цёлку

Прапрацаваўшы пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб дапамозе бескароўным калгаснікам, калгас „Новы быт“ вызначыў ужо цэлы рад мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтай пастановы.

Па плану камплектавання МТФ нам патрэбна гадаваць 12 цялушак, у нас жа гадуецца 17 штук. Мы абмеркавалі, каб цялушак аддаць бескароўным ў выплату па растэрміноўцы. А бескароўных у нас 6 калгаснікаў, сярод іх ударніца Міснік Прасіня. Ёй мы, як ударніцы, дамо цёлку ў першую чаргу, бо яна гэтага заслужыла.

Старшыня калгаса „Новы быт“
Маляўка Восіп.

Буду змагацца за заможнае жыццё

Я, звеннявод калгасу імя Калініна, бескароўная. У гэтым годзе, калі прачыталі пастанову партыі і ўраду аб дапамозе бескароўным калгаснікам, праўленне стала клапаціцца, каб шляхам закупкі ў аднаасобнікаў, ці праз ферму дапамагчы нам бескароўным. Я таксама запісана ў кандыдаты на атрыманне цёлкі. Да гэтага часу я працавала па ўдарнаму. Зараз, у адказ на гэтую пастанову партыі і ўраду, я яшчэ больш упарта разам з сваім звяном буду змагацца за дабраякасны лён, за сваечасовую здачу яго дзяржаве,—гэта значыць, што буду змагацца за выкананне дырэктыў партыі.

Калгасніца-ударніца
Проска Лях.

Лепельск. раён.

28 лепшых калгасніц—у старшыні сельсаветаў

(*Працяг*)

8. Мабілізаваць увагу ўсіх рабселькораў сельсаветаў і культурныя сілы на арганізацыю выпуску насценных газет пры сельсаветах і калгасах у кожную пяцідзёнку.

9. Кожнай курсантцы устанавіць сталую сувязь з аддзелам кадраў ЦВК БССР праз пасылку звестак, не радзей аднаго разу ў месяц, аб выкананні ўзятых на сябе соцабавязацельстваў.

10. Сістэматычна дапамагаць у выкананні фінплана дабраахвотных плацяжоў і ў прыватнасьці абавязваемся ўключыцца ў непасрэдную работу па выкананні плана ашчадкас 3-га квартала, разгарнуўшы шырокую масавую большэвіцкую работу па сканчэнні ў вёсцы рэалізацыі пазыкі да 10 верасня гэтага году сярод аднаасобнікаў і 100 проц. ахопу падпіскай усіх працаздольных калгаснікаў, разгарнуўшы для гэтага сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

11. Забяспечыць 100-проц. масавае паступленне падпіскі ад калгаснікаў.

а) Змагацца за выкананне планаў па ўкладах у ашчадкасы і 100-проц. выкананне па калектыўнаму страхаванню жыцця;

б) у штодзённай рабоце дапамагаць селькамсоду па абслугоўванні пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў, раздачы поўнасцю аплачаных аблігацый масавых пазык;

в) трымаць сыстэматычную сталую сувязь з цэнтральнай камісіяй садэйнічання, шляхам пісьмовых інфармацый.

БАЙКАШ.

Мешчаракоў.

За наша соцыялістычнае

Марыля Лаўнічук.

Ідзем праз поле. Цяжкае, нібы свінцом налітае, калоссе ядранога жыта да ног схіляецца. Вышэй за калена стаяць густыя канюшыны. Аўсы сёлета на дзіва ўрадзілі. Нават бывалы дзядуля Якуб з Паперні і той не памятае такіх урадлівых аўсоў.

Выходзім з пералеска. З крутога касагора мужчынскай шпаркай хадою ідзе загадчыца фермы Марыля Лаўнічук. Убачыўшы нас, заклапочаны Марылін твар засвяціўся сяброўскай, ветлівай усмешкай. Але калі загаварылі пра ферму, на ім зноў з'явілася клапатлівасць гаспадара.

— Ды што гаварыць. Хадзем на выпасы і вы ўласнымі вачыма ўбачыце наша пагалоўе.

За ўзгоркам, на зялёным аўсянішчы рассыпалася стада. Падняўшы ўгору ружовыя пячаткі, свінні задаволена чаўкаюць, ядучы былінкі сакавітага аўса і знойдзеную ў зямлі спажыву. Юркія парасяты рыюць тупымі рыльцамі зямлю, бегаюць наўзавадкі адзін перад адным, а на водшыбе два сысункі на хаду ссуць матку.

— Бачыце, якія замораныя свінні,—кажа Марыля, паказваючы на стада. Сапраўды, свінні схудалыя. На шмат якіх шчаціна стырчма стаіць.

— Толькі выпасы і ратуюць нас. Калі-б іх не было—справа была-б дрэнь. Вы толькі падумайце таварышы, — кажа Марыля,—мы сьвінням даем усяго палову канцэнтраваных кармоў. Яны ў нас па міласці дырэкцыі на паўгалодным пайку жывуць. Атрымалі мы з трэста кармы—і муку, і жмыхі, і ўсё што трэба. Але дырэкцыя распарадзілася свінны корм коням ды каровам аддаць. Вось і сядзі на галоднай норме.

— Ну, гані свінней на раку,—скамандавала Марыля пастуху.

У мелкай рачулцы, пад спёкай сонечных праменняў удоваль купаюцца свінні. Дзіка пішчаць парасяты, калі Марыля, злавіўшы якога-небудзь з іх, паліваe халоднымі ручайкамі свежай вады.

* * *

Вечарэе. Сонца хаваецца за небасхіл. Са скошанай сенажаці дыхнула сенам і халадком. З боку, ідзе ўваходзе ў свінарнік, стаіць карыта з дэзынфікуючай рашчынай.

— Вытрыце ногі ў карыце, каб заразы нам не занесці,—сустрэўшы нас у дзвярах, прагаварыла брыгадзірка Юшкевіч Волька. У свінарніку чыста і суха. Станкі зелянінаю ўбраны.

— Каб паветра было чысцейшае, свінням вальней дыхаць,—тлумачыць брыгадзірка. У шэрых Волькіных вачах дрыжаць усмешкі радасці. У адным са станкоў, на залацістай саломе на ўвесь вугал разляглася матка. Дванаццаць крамяных парасят, штурхаючы мордачкамі ў пругкае вым'я, старанна ссуць цёплае матчынае малако.

— Бачыце, якія крамяныя і поўненькія парасяты,—з гонарам зноў загаварыла Волька.—А чаму? Добры догляд. Парасё, як дзіце — добры догляд любіць. Вунь тое крайняе,—паказала яна на худзенькае парасё,—ад смерці выратавалі. Нарадзілася яно, скажу вам, такім, што і глядзець не было на што: маленькае, шчупленькае, вось-вось згіне. Нават маткі ссаць не ўмела. Каб не даглядзелі—згінула-б парасё. Мы яго малачком з соскі выхадзілі. Акрыяла, расце парасё. Волька паправіла на галаве хустку і, заружавеўшыся, ціха прагаварыла:

— Спаборнічаем мы. У конкурс уключыліся. Спачатку ва ўсебеларускі, а цяпер і ва ўсесаюзны. Умова ў нас такая: ніводнага парасяці ня страціць.

— Свайго слова мы цвёрда трымаемся,—умяшалася ў гутарку бойкая, маладая свінарка Абцяжка Вера. Парасяты цалюсенькі ўсе да аднаго,—сказала яна і хітравата ўсміхнулася. Толькі вось у чэрвені адно захварэла. Глядзім—марнее парасё. Мы і да ветэрынара яго, і малаком адпойваем, але нічога не дапамагае. Згінула. Што з ім здарылася—розуму не прыложым,—цяжка ўздыхнуўшы, скончыла Вера.

— А ці даўно, гэта-ж усяго якіх-небудзь два месяцы таму назад, як мухі дохлі на ферме парасяты. Ніхто не клапаціўся. Не думаючы, за ногі ды вон выкідалі нежывое парасё.

— А цяпер, як спаборнічаць ды ўдарнічаць пачалі—справа інакш пашла,—падыходзячы да нас, зноў загаварыла Волька. Калі-б згінула ў мяне ў брыгадзе парасё—я абняславілася-б на ўвесь саўгас. Засмяялі-б. Я ўдарніца і брыгада ўдарная. Як-жа нам ззаду плесціся. Таварышкі мне ўсе вочы выкалалі-б дохлым парасём.

І, прыгадваючы мінулыя дні, тав. Волька апавядае.—Быў у нас такі выпадак. Пачалі мы спаборнічаць. Толькі на зорку зоймецца—мы на ферму бяжымо. Усяго адна свінарка Бойка з халадком да справы адносіцца. Свінні ў яе самыя горшыя ва ўсёй брыгадзе. Мы ёй падабру казалі: старайся, не падводзь нас. Але яна і вухам не вядзе. Тады назіраць за ёй пачалі. Што-ж аказалася? Свінней яна корміць як папала, ды ў дабавак яшчэ муку крадзе. Затрымалі мы яе з мукою. Наш бабскі сход наладзілі. Ну і дасталося-ж ёй! Усё, што на душы набалела, у вочы выказалі і ўсім сходам пастанову вынеслі—пад суд аддаць. Волька на хвілінку задумалася. Абцягваючы сіні халат, пачала гаварыць далей.

— Цяпер работа на мілую душу ідзе. Сэрца радуецца. Нават у самую бяскормiцу памаленьку ды пакрысе спраўляліся. Доглядам добрым, выпасамі ды купаннем выратоўваем наша пагалоўе.

— Ой,—схамянулася раптам Волька. — Здаецца дзеткі мае пад'елі, трэба бегчы другіх накарміць. І спрунжынячы загарэлыя, пругкія ікры босых ног, Волька вопрамеццю кінулася ў другі канец свінарніка. Загнаўшы ў станкі пад'еўшых, сытых парасят, яна, закасаўшы рукавы,

разам са свінаркамі пачала замешваць свінням і разліваць у карыты смачную яду.

— Вера, выпускай парасят са станка,—гукнула яна свінарцы. Дробна стукаючы жвавымі капыткамі па драўлянай падлозе, хлынулі парасяты да напоўненых кармешкаю карыт.

— Волька, або ты Вера, адганіце „бандытаў" да другога карыта, яны есці не даюць другім, — уваходзячы ў свінарнік, строга заўважвае загадчыца фермы Марыля Лаўнічук і, звяртаючыся да нас, гаворыць:

— Бяда з „бандытамі". Крыху не дагледзь і пашоў беспарадак. „Бандыты" — здаровыя, самыя моцныя парасяты, гаспадарамі расхаджваюць па сталовай, адганяюць ад карыт слабейшых і, паўлазіўшы з нагамі ў карыты наўзавадкі, ядуць зялёную мешаніну.

— Пашлі адсюль, — адганяе Марыля „бандытаў".

— Яны, чарцяняты, аб'ядаюцца, а другіх галоднымі пакідаюць. Вось чаму пры кармленні нельга нікуды адыходзіць. Пільна глядзець трэба. Аглядаючы станкі, Марыля коратка апавядае аб непрыглядных, змрочных днях фермы.

— Стары загадчык,—гаворыць яна,—за вялікага спецыяліста ў саўгасе выдаваў сябе. А што вышла? Пустабрэх, болбацень пусты. Ён нават не ведаў, якіх і колькі кармоў трэба даваць свінням. І вось вам вынік.—Марыля дастае з бакавой кішэні рабочай кофты запісную кніжку. Бачыце,—гаворыць яна далей.—За паўгода ў нас нарадзілася 413 парасят, а пала і вымушана-забітых—149. Куды к ліху такая справа варта. Гэта-ж кожнае трэцяе народжанае парасё за ногі ў яму выкідалі. Не прыбытак соўгасу, а гора адно. Цяжка нам цяпер, але з кожным днём выпраўляемся.

* * *

Змрок ахутаў зямлю. Зморанае сонца даўно за небасхіл схавалася. Волька скончыла карміць апошнюю партыю свінней і перад адыходам заглянула ў станок шматдзетнай маткі. Матка неспакойна зарохкала—сон парушылі. Крамяныя парасяткі збіліся ў кучу і соладка храпуць. Толькі маленькае парасё, якое нам паказвала Волька, бегала па клетцы і нездаволена вярашчэла. Волька ўзяла яго на рукі, дастала з кішэні паўбутэлькі цёплага каровінага малака і, усадзіваючы у рот гумовую соску, прыгаварвае.

— Еш даражэнькае, расці маё роднае...

— Еш, расці і дужэй, будзь вялікім і здаровым. Харошае ты маё...

Накарміўшы сысунка, Волька яшчэ раз абышла, агледзела гаспадарскім вокам адпачываючых свінней з парасятамі і, пераканаўшыся, што ўсё ў парадку, ціха сказала:

— Ну, адпачывайце, спеце мае дарагія.

Так працуюць, так змагаюцца ўдарніцы, так вырошчваюць і гадуюць добрыя, сытыя, нашы соцыялістычныя стады.

Соўгас „Комсамолец", Менскі раён.



На здымку: Свінні СТФ калгаса „Чырвоны партызан" (Крычаўскі раён).

БАРАЦЬБА ЗА ДОБРАЯКАСНЫ ЛЕН

Калгас „Чырвонае Забалоцце", Лепельскага сельсавета, за 8 дзён скончыў цераблення ільна на плошчы 112,6 *га*. Увесь лён выцераблен у ранняй жоўтай спеласці. Перастаяцца ня далі ніводнаму гектару. Ужо лён больш як з 30 *га* абмалочан і разасланы.

Уперадзе ідзе шостая брыгада, якая засеяла 22 *га* ільна. На работу выходзяць не толькі тыя жанчыны, якія лічацца ў спісах брыгадзіраў, як працаздольныя, але і старыя і падлеткі. Лепшымі ўдарніцамі гэтай брыгады з'яўляюцца Яско Таццяна, Кальчэўская Наста і інш. Яско скончыла курсы па першапачатковай апрацоўцы ільна і з'яўляецца ў брыгадзе адказнай за лён. Пільна сочыць Яско Таццяна за якасцю цераблення, за тым, каб своечасова лён вязаўся і звозіўся з поля. За ўдарную работу шостая брыгада занесена на чырвоную дошку.

Ня горш за Таццяну працуюць: Азаронак Ганна, Шартук Аўдоця, Жарнасек М., Ігнатовіч Аўдоця і Жарнасек А., якія адказваюць за лён у брыгадах.

Калгасніцы ведаюць, што ў гэтым годзе яны павінны атрымаць за лён ня менш як 700 пудоў збожжа, але пры ўмове, калі вартасць ільна будзе добрая, траста ня ніжэй № 1,75 і ільновалакно ня ніжэй 8 нумара. Калгасніцы змагаюцца за 12 нумар.

В. і Г.

Лепельскі раён.

Калгасніцы „Авангарда"—ударніцы збожжапастаўак.

(*Ад выязной брыгады часопісі*).

Калгас „Авангард" (Несенскі сельсавет, Лепельскі раён) за 8 дзён убраў жыта на плошчы 320 га. У мінулым годзе жыта ўбіралася 15 дзён. Яшчэ ня скончылася ўборка, ўжо распачалі працу малатарні. Рыхтавалася жыта да здачы. Першая партыя жыта ў 250 пудоў была забракавана, з прычыны вялікай вільготнасці. Здача жыта зацягвалася. На гэта хутка рэагаваў палітаддзел.

Лепшыя людзі калгаса—ўдарніцы жыва адгукнуліся на заклік палітаддзела аб арганізацыі жаночага чырвонага абоза. Кожная брыгада рыхтавалася да здачы.

Цэлую ноч працавала малатарня ў брыгадзе Зазеры. 18 жанчын разам з калгаснікамі ўсю ноч рыхтавалі дабраякаснае жыта для абоза. У работу ўносіла перабоі нераспарадчасць самога праўлення—то масла для змазкі машыны не хапала, то газы для трактара не было. Прастоі хвалявалі тых, хто працаваў пры малатарні.

Тут-жа недалёка ад малатарні працавалі трыеры і адсартаванае зерне насыпалася ў мяхі і ў другі раз важылася.

Цікавіла пытаньне—хто паедзе. Перакідваліся жанчыны думкамі ў час працы, кожнай хацелася паехаць у абоз, ведалі, што паедуць лепшыя, што ўдзел у абозе—гэта гонар. І калі было вырашана пытанне, што паедуць Субач Антуніна і Юрчанка Дуня, то ў брыгадзе разгарнуліся самыя гарачыя спрэчкі.

— А ці сапраўды яны ўдарніцы.

— А можа каго іншага трэба.

Спрэчкі паказалі, што ні праўленне, ні парт'ячэйка, якая ёсьць у калгасе, ніякай работы з ударнікамі не вядуць. Брыгады не ведаюць сваіх ударнікаў. Улік іх вядзецца толькі ў канцылярыі калгаса.

Адначасова з брыгадай Зазеры былі праведзены гутаркі ў брыгадах Іюткі, Азёрава, Баброва, Гарані, Галаі і вылучаны лепшыя ўдарніцы для ўдзелу ў абозе.

Калгас раскіданы. Паасобныя брыгады вязуць збожжа рознымі дарогамі ў Лепель. Яны ўсе павінны з'ехацца пад Лепелем.

Спяшаюцца брыгады, каб не спазніцца.

Першай прыехалі брыгады Галаі і Гарані. Лепшыя ўдарніцы гэтых брыгад Вашук Агата і Галай Прося ўзначальвалі абоз. Ва ўмоўленым месцы сустрэчы яны спыніліся, каб пачакаць астатніх. Хутка з'ехаліся усе і абоз у 16 падвод павёз на загатпункт 4815 *кгр* збожжа.

Жаночы абоз прынялі без чаргі на здатачным пункце. Вашук Агата, расчырванелая, таксама здымала мяхі па 5 пудоў з падвод, клала на вагу і з вагі насіла ў вагон.

— Во баба, дык баба,—чуліся галасы.—А паглядзелі-б вы на яе за працай у полі,—дадавалі яе таварышкі. Яна з канём на пахаці і на іншых работах ніколі не адстае. Гэта наша найлепшая ўдарніца. Так характарызуюць Вашук Агату калгасніцы з калгасу „Авангард".

Багрэц Марфа і іншыя дзяўчаты былі заняты больш каля мяхоў і падвод—даглядалі, падлічвалі.

Здаўшы збожжа, удзельніцы чырвонага абоза напіліся чаю, тут-жа на здатачным пункце купілі ў ларку цукру і махоркі, і паехалі да дому, вельмі задаволеныя ўдалай арганізацыяй абоза.

В. і Г.

Лепельскі раён.

Вучыцца працаваць у сушанцаў

На ўзгорку паміж вазёрамі Цемяніцай і Окзінам, якія прыгожа апаясаны чаротам—раскінулася вёска Суша. Удзень пройдзеш па вуліцы, вакяніцы пазакрываны, ні жывой душы не сустрэнеш—усе на полі.

Ужо пяць дзён ідзе ўпартая барацьба на ільняных палёх.

Сёння апошні дзень і 29 гэктараў вырвана, адсартавана, пастаўлена ў бабкі. Сушанскія калгасніцы добра ведаюць, што цярабленне—гэта толькі пачатак, што наперадзе — слаць, падымаць, мяць, трапаць. Таму і рукі хутчэй ходзяць, таму ў жмені, як мага больш, набіраецца.

У чым сакрэт перамог Сушанцаў, якія 23 жніўня скончылі цярабленне ільна, а 24-га разаслалі і добрую палову абабілі.

Увесь сакрэт у расстаноўцы сіл, у свядомай працоўнай дысцыпліне. На поле сушанцаў люба ўзыйсці. Арганізаваная праца па звеннях, сацспаборніцтва паміж звеннямі і індывідуальнае, строга наладжан улік--вось што вырашае перамогу, дае ўпэўненасьць у заўтрашнім дні.

Яшчэ здалёк чуваць закацістыя спевы. Кожнае звяно мае свой спеў, якія разам зліваюцца у нейкую дзіўную сімфонію працы.

У Сушы не мілуюць і гультая. Вось у звяне Мар'і Шуманскай працавала Ліда Шуманская, ды гультаявала,— расказваюць калгасніцы.

— Мы гэта сабраліся і сказалі ёй проста, што трэба працаваць, і што мы на яе працаваць не будзем. Назаўтра ў звяно не пусцілі яе. Яна працавала некаторы час адна, а зараз выправілася. Мы яе прынялі зноў у звяно. Грэх сказаць што-небудзь дрэннае цяпер пра яе. Добра працуе.

Норма выпрацоўкі ў калгасе 0,06 *га* на працадзень. Лепшыя ўдарніцы заўсёды перавыконваюць гэтую норму. Толькі пройдзеш па полі, дзе калгасніцы разгорнутым фронтам наступаюць на лён, адразу ўбачыш хто з шчырасцю працуе, а хто абыяк адбывае.

Гамзюк Хрысця здалёку відаць. Яна працуе лепш за ўсіх, працуе спорна і хутка. Крыху далей, лёгка пазнаеш яе старэйшую сястру Насту, якая працуе не з меншай стараннасцю. Гэта з другой брыгады. А з першай—Шуманская Мар'я, Шуманская Мар'я Адамава і сямідзесяцігадовая бабуля Скакун Хадося Раманава паказваюць вельмі добрыя прыклады. Калі лён быў пасланы, адказнай за яго выбралі Шуманскую Марыю. Яна ўжо так сабе міма сцелішча ня пройдзе—там паправіць, там пагладзіць, патрэ ў руках, клапоціцца ці не пара ужо падняць яго, каб не празяваць хаця. Упартай барацьбой за лён Сушанцы даб'юцца яго высокай якасьці—ня ніжэй 12-га нумара.

Б. і К.

Стварыць усе неабходныя ўмовы для вучобы

Старшыня ЦКК БССР тав. Лычоў па радыё расказвае піянерам і школьнікам аб трыццацігадовым гераічным шляху комуністычнай партыі.

1-га верасня распачаўся новы навучальны год. Школьныя пакоі напоўніліся гоманам школьнікаў—гэтай радаснай і бадзёрай дзетвары. Зноў разгарнулася барацьба за аўладанне марксіцка-ленінскім вучэньнем.

Менскі раён мае не мала дасягненняў у падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Такія фабрычна-заводскія сямігодкі, як 22, 13, 28, 25, 20, 1 і шмат іншых па-баявому распачалі вучобу. Гэтыя школы своечасова адрамантавалі лаўкі, пабялілі сцены, памалявалі падлогі своечасова запасліся дрывамі і г. д.

Аднак, нажаль, прыходзіцца канстатаваць, што яшчэ і на сённешні дзень ёсьць цэлы рад недапушчальна-ганебных недахопаў.

Па Менску у яго пэрыфэрыі ў гэтым годзе 206 школамі павінна быць ахоплена 34.060 дзяцей. Аднак, ёсць меркаваньні ў МенГарАНА, што лік дзяцей, прадбачаны плянам, будзе значна зменшан.

Намеснік загадчыка ГарАНА тав. Яскевіч, які непасрэдна ведае ўкамплектаваннем школ, нават не паклапаціўся аб тым, каб школы рэгулярна інфармавалі яго аб ходзе рэгістрацыі.

Па віне загадчыка 39 фабрычна-заводскай чыгуначнай сямігодкі тав. Мялешкінай ганебна праваленa работа па рэгістрацыі вучняў. Рэгістрацыя пачалася на 8 дзён пазней вызначанага тэрміну, бо гэтая паважаная загадчыца самавольна паехала ў адпачынак.

Ганебны правал у падрыхтоўцы да новага навучальнага году мы маем і ў 15 фабрычна-заводскай сямігодцы. Тут яшчэ да гэтага часу не адрамантаваны печы. Загадчык школы тав. Казлоўскі ў час адпачынку прагуляў усю падрыхтоўчую кампанію.

Можна было-б назваць яшчэ рад непадрыхтаваных да вучобы гарадскіх школ, але даволі і гэтага, каб пераканацца, што гарадскі аддзел Народнай Асветы ня здолеў забяспечыць жывога аператыйнага кіраўніцтва ў справе падрыхтоўкі да новага навучальнага года шмат якімі школамі горада.

А ў якім становішчы распачалася вучоба па школах Менскага раёна.

Тут таксама з боку кіраўніцтва ГарАНА ёсць вялікія прабелы. Такія школы, як Пятроўшчынская, Уруцкая, Гатаўская, Міханавіцкая, Баравецкая, Зарэчынская, Сінілаўская і інш. у выніку прамога сабатажа дырэктыў партыі і ўраду з боку сваіх загадчыкаў, распачынаюць навучальны год з глыбокімі прарывамі.

Больш таго, такія сельсаветы як Папярнянскі, Прыгарадны, Бароўскі, Гатаўскі, Ратамскі, старшыні калгасаў гэтых сельсаветаў і дырэктары саўгасаў надапушчальна ганебна аднесліся да падрыхтоўкі да новага навучальнага года, чым фактычна сарвалі гэтую важнейшую справу.

Новы навучальны год разгарнуўся. Дзеці правучыліся ўжо некалькі дзён і ўжо з першых дзён вучобы адчуваецца непадрыхтаванасць некаторых школ.

Неабходна зараз-жа, на хаду выправіць усе недахопы і стварыць неабходныя ўмовы для вучобы. У гэтым павінны дапамагчы школе бацькі. Павінны дапамагчы і жанчыны актывісткі і дэлегацкія сходы.

Шуб, Варанецкі.

Новая сямігодка, пабудаваная ў калгасе III Інтэрнацыянал (Клімавіцкі раён).

Разгорнутым соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам даб'емся

Дэлегаткі ўзначальваюць

(На нарадзе звеннявых)

Іх пяць маладых здаровых звенняводаў. Яны, з заклапочанымі тварамі, гавораць аб працы сваіх звенняў, аб тым, як хутчэй і лепш апрацаваць лён і здаць дзяржаве.

Манька Галец, моршчачы лоб, выкладвае:— жанчыны ў нашай 4 брыгадзе працуюць па-ўдарнаму. Першае звяно, дзе старшай дэлегатка Кацярына Лясун, выпрацоўвае па 16—17,5 сотак. Больш за гэта звяно ў нашым калгасе ніхто не выпрацоўваў. Лепшыя ўдарніцы ў нашай брыгадзе: **Лясун Кацярына, Машара Наста, Лясун Ганна Герасімаўна, Лясун Волька, Машара Волька, Галец Мар'я, Сухачэўская Улляна.**

За звеннявод ам 4 брыгады дакладвае звеннявод 3 брыгады Машара Ганна. Яе брыгада па ільну ідзе ўперадзе. Ужо 4 *га* абмалочана і паслана. Яна пералічвае сваіх ударніц. Удзел у абмеркаванні прымаюць ня толькі звенняводы, але і ўсе дэлегаткі і жанчыны, якія сабраліся на нараду. Калі абмеркавалі ўдарніц 4 брыгады, спыніліся на Матруне Бык. Яна часта робіць прагулы і таму парашылі, што ўдарніцай яе назваць нельга. Выкраслілі таксама з ударніц у 2 брыгадзе Жывету Таццяну.

... Адна за аднэй усе пяць гавораць аб працы, аб людзях. Няма, згінула тая ўпартая кругавая парука за тых, хто гультаяваў, якая была ў час жніва ў 4 брыгадзе.

... А было гэта так. Працавала чацвертая брыгада агулам у 30 жанчын. Прыходзіў да іх старшыня і жанорг Райкома, прыяжджалі з Менску, растлумачвалі карысць працы звеннямі. Упіраліся, не хацелі. Заяўлялі: мы ўсе ўдарніцы, мы ўсе аднолькава працуем. Але пасля ўлік паказаў няпраўду іх доказаў. У брыгадзе 2, 3, 1 неаднолькава выпрацоўвалі жнеі. Адна—11 сотак, а другая аж 16—17. Захацелася пасобным членам і з 4 брыгады вырабляць больш.

Цікава аб гэтым расказвае Кацярына Лясун і самая заўзятая супраціўніца звенняў Матруна Бык.

Пасварыліся мы, ну і падзяліліся.

— А за вошта пасварыліся?

— Ды як-жа не злаваць? Чакаць каля хат прыходзіцца па цэлай гадзіне, а то і больш пакуль збяруцца ўсе трыццаць, ды і працуюць ня ўсе роўна.

На ільне 4 брыгада працавала ўжо звеннямі. Цяпер калгасніцы з 4 брыгады гавораць, што ніколі яны не будуць працаваць агулам.

Адказная за лён у калгасе Проска Лях выказвалася апошняй. Яна падкрэсліла вялікі недахоп у рабоце. Вырваны лён ляжыць з галоўкамі на полі па 5—9 дзён.

Нарада звенняводаў разам з жаночым актывам прыняла рад самаабавязацельстваў

Звязаць і звезці з поля ўвесь лён за два дні.

Арганізаваць у брыгадах кругласутачны абмалот.

Расціл скончыць да 6 верасня і даглядзець лён на сцелішчы так, каб дабіцца 12 нумару.

Загадзя праверыць сушні і паклапаціцца аб дровах.

Здаць ільновалакно і трасту ў тэрміны, вызначаныя партыяй.

Усю работу асвятляць у часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі".

Нарада даручыла Марыне Лясун правесці падпіску на часопіс.

Характэрна для калгасу імя Калініна (Лепельскі с/с), што жаночы актыў калгаса—звенняводы **Шарстук Сашка, Лях Каця, Машора Ганна, Галец Манька,** адказная за лён **Проска Лях,** загадчыца МТФ і член праўлення **Марына Лясун, Кацярына Лясун**—з'яўляюцца ўсе дэлегаткамі. Іх выхаваў дэлегацкі сход, які колісці тут працаваў. Яны сябе і па сённешні дзень лічаць дэлегаткамі і скардзяцца, чаму іх ніхто не збірае, ніхто з імі не пагутарыць аб працы, не дасць належнага напрамку.

— Вы толькі паглядзіце! Нас сіла—18 чалавек. Толькі трэба, каб намі к'равалі, — гаворыць лепшая актывістка, дэлегат усебеларускага з'езда Марына Лясун.

Жанорг Хіма Хмялеўская, якая з'яўляецца парторгам партыйна-комсамольскага ядра ў гэтым калгасе, сядзіць тут ужо бязвыязда $1^1/_2$ месяца і жанработай зусім не цікавіцца.

Калгасніцы калгаса імя Калініна чакаюць аднаўлення работы з жаночым актывам. Слова за райкомам партыі.

Выязная брыгада часопісі
Булко, Куніна.

Лепельскі раён.

Ільноцерабілка „Комсамолка" за работай у калгасе Чарвякова (Мсціслаўскі раён).

лепшай якасці ўборкі, апрацоўкі і здачы ільна дзяржаве

ЗМАГАРЫ ЗА ЯКАСЦЬ ІЛЬНА

Тэкля, лепшая ўдарніца, адказная за лён з другой брыгады, крыху падумаўшы, стала дакладна расказваць пра спаборніцтва з жанчынамі першай брыгады. Яшчэ вясною Воюш Тэкля заключыла дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з жанчынамі групы Параскі Лейкі з першай брыгады. Пункты дагавору гавораць аб дабраякаснай уборцы без страт. Жанчыны першай брыгады спаборнічалі з другой за своечасовую ўборку ільну ў ранняй жоўтай спеласці, за выхад валакна ня ніжэй 12 нумару. Пяршынство ва ўборцы і расціле атрымала брыгада № 2, а разам з ёю і Тэкля. Упартая барацьба за поўнае ажыццяўленне дагавору не спыняецца.

У Тэклінай брыгадзе 13 жанчын. Брыгада мае $9^1/_2$ *га* лёну. У Брыгадзе Параскі—17 жанчын і за ёю—10,5 *га* лёну. Змагаючыся за першынство, кожная з іх шукала лепшых мэтадаў працы. Тэкля разбіла сваіх жанчын на звенні і для большай прадукцыйнасьці працы давала кожнаму звяну акрэсленае заданне, заўсёды своечасова абвяшчаючы яму, колькі выпрацавана за дзень. Гэта заахвочвала. Большасць жанчын выходзіла на работу з усходам сонца.

Ласкава, як маці дзіця, пеставалі калгасніцы лён, тут-жа на полі сартуючы яго—большыя і лепшыя снапы клаліся асобна. Пасля сушылі, абівалі, расцілалі па гатунках.

13 дзён ляжаў лён на сцелішчы. Тэкля хадзіла каля яго, шчупала, церла ў пальцах і нарэшце вырашыла, што лён вылежаўся. Узяла цэлы сноп пробы. Падсушыла ў печы, зьмяла на ручной мялцы і прынесла сноп—пробу старшыні.

Тав. Маляўка занёс пробу ў Загатлён. Там вызначылі—16 нумар і адразу выдалі прэмію—40 асьмушак табакі, што Тэклю вельмі ўзрадавала.

— Ну, што-ж,—гаварыла яна. Сеялі яго яшчэ да першага мая, палолі тры разы; а як убіралі, то ў кучках падсушвалі. Інакш яно і быць ня можа.

Лепшыя ўдарніцы ўзначальваюць работу звенняў. Міснік Аўгіня, Міснік Параска, Капюшкевіч Люба. Яны мяркуюць, што большая палова лёну будзе 16 нумар, меншая—12 і зусім нязначная частка—8. Самі калгаснікі бяруцца здаць увесь лён ільно-валакном, каб больш атрымаць збожжа. Адстае брыгада Параскі. Ганчар Палагея з гэтай брыгады ў самы разгар цераблення і абіўкі ільна хадзіла ў грыбы і зрывала работу. Шавура Паланея, Лейка Хадора, Лейка Яніна — слалі лён густа, што вельмі дрэнна адбіваецца на якасьці валакна, бо знізу лён падгнівае, а да верху раса не даходзіць, значыцца, лён неаднолькава вылежваецца. Праўда, гэта потым выправілі, але лён быў падняты на тры дні пазней за другую брыгаду.

У спаборніцтве перамагла Тэкля і яе брыгада. Яна дае лён лепшай якасці, аб чым яскрава гаворыць першая проба.

Тэкліна брыгада з'яўляецца законным кандыдатам на прэмію. Прызвычаілася Тэкля да сваіх абавязкаў. Яна і дома ўвесь час занята з пробамі розных гатункаў ільна: адзін мочыць, другі сушыць, трэці трапае.

Ударная праца лепшых калгасніц калгаса „Новы быт" дасць валакно дзяржаве ня ніжэй 12 нумару.

О. і А.

Лепельскі раён.

Перамога калгаса імя Карла Маркса

Калгас „Карла Маркса", Крычаўскага раёна, лічыцца лепшым калгасам па Кашанскім сельсавеце. Ён добра спраўляецца з усімі задачамі. Калгаснікі ўзялі на сябе абавязацельства завяваць першынство ў раёне па ўборцы, дзяржаўных пастаўках і асеньняй сяўбе.

Кожны дзень калгаснікі правяраюць, як выконваецца ўзятае імі абавязацельства.

Калгас першым у раёне распачаў жніво—25 VII, і з першых 6 *га* ячменю 31-VII здаў у лік паставак дзяржаве 224 цэнтнэры, што складае 100 проц. плана па ячменю. Гэта было ў той час, калі яшчэ на ссыпным пункце не было ніводнага зярняці.

15 жніўня калгас поўнасцю выканаў план паставак жыта (71 цэнтнэраў). Жанчыны, на чале з дэлегаткай Машай, арганізавалі хуткую прасушку аўса і 17 жніўня поўнасцю здалі дзяржаве дабраякасны прасушаны авёс. Засталося здаць пшаніцу, бульбу і лён.

Гэтымі днямі калгас адгружае пролетарам горада Ленінграда ў лік паставак 40 *цнтн* бульбы.

Цераблення ільна на 21 гектары скончана 18 жніўня. 25 жніўня, паводле ўзятага калгасам абавязацельства, павінна быць скончана асенняя сяўба жыта і пшаніцы.

Гэтыя поспехі калгас „Карла Маркса" мае дзякуючы шырока разгорнутаму сацспаборніцтву паміж брыгадамі, звеннямі, пасобнымі калгаснікамі і калгасніцамі, дзякуючы правільнай расстаноўцы сіл. На ўсіх вучастках работ ёсць комсамольцы. У брыгадах ёсць агітатары.

Першае месца па ўсіх вучастках займае брыгада № 2 Шырхэнкі Івана. Гэта брыгада скончыла жніво на паўдня раней астатніх двух брыгад, лепш падрыхтавалася да асенняй сяўбы і першая разлічылася з дзяржавай.

Вось прыклад малацьбы другой брыгады. Была арганізавана міжбрыгадная малацьба на паўскладанай малатарні. Для малацьбы была вызначана аднолькавая колькасць рабочых у брыгадах. Чуць толькі пачне віднець—людзі брыгады № 2 Шырхэнкі Івана ўжо даўно на месцы разам з сваім брыгадзірам. Калі-ж рабочыя ад брыгады № 3 Шалашэнкі пачалі з'яўляцца на работу аж праз паўтары гадзіны, то да работы не былі дапушчаны. Шырхэнка вызначыў сваіх людзей, не траціў часу, чакаючы рабочых брыгады № 3. Такім чынам, дзякуючы брыгадзе № 2 было абмалочана збожжа і калгас разлічыўся з дзяржавай.

Галя.

Крычаўскі раён.

УДАРНІЦЫ ЎБОРАЧНАЙ

Настаўніца Клімашэўская—ударніца ўборачнай

Настаўніца калгаса „Труд", Тураўлянскага сельсавета, Н. Клімашэўская ў пачатку ўборачнай на імя рэдакцыі газэты „Чырвоная Полаччына" прыслала наступны ліст:

— „Паважаныя таварышы! Я абвяшчаю сябе ударніцай ўборкі і загатовак. Абяцаю працаваць на полі па меры магчымасьці, плячо ў плячо з лепшымі ўдарніцамі калгаса. Акрамя таго абавязваюся ўзняць работу насценгазеты „Ударнік", рэдактарам якой я з'яўляюся яшчэ на больш высокую ступень. Прашу надрукаваць мой ліст у газеце, бо я спадзяюся, што многія настаўнікі Полаччыны паследуюць майму прыкладу, дапамогуць сваім калгасам у барацьбе за першынство ва ўборцы і загатоўках".

Н. Клімашэўская.

Выклікаўшы настаўніцтва Полаччыны на соцспаборніцтва, Клімашэўская ўзялася за работу. Пры яе дапамозе ў калгасе арганізаваліся масавыя выхады ў поле, да якіх прыцягваліся і аднаасобнікі. Клімашэўская дабілася таго, што загадчык крамы Паўлоўскі выяжджаў у поле з прамтаварамі і разам са старшынёй калгаса Пяршовым на месцы работы арганізоўваў для касцоў сняданні і гарбату.

Пасля снядання Клімашэўская чытала касцом новы нумар насценгазеты. Касцы з вялікай увагай слухалі, а потым выяўлялі сваіх лепшых ударнікаў, якіх прэміявалі мануфактурай па 4 мэтры кожнага.

Перад пачаткам уборкі жыта у калгасе была складзена ўдарная група жанчын, якая зараз сістэматычна перавыконвае нормы па жніве. Паміж калгаснікамі разгорнута соцспаборніцтва. Лепшымі ўдарніцамі з'яўляюцца: Вялюга Наталля, Вялюга Ганна, Пярошава Ксеня і 55-гадовая калгасніца Татарыс Анэля. Настаўніца Клімашэўская выходзіць з гэтай брыгадай у поле і жне з імі разам жыта. Клімашэўская спраўляецца выконваць і даручэнні праўлення—весці ўлік работы і рэгулярна выпускаць у калгасе насценгазэту. У газэце яна змяшчае матар'ял пра лепшых ударніц і іх партрэты ўласнай зарысоўкі, якія выходзяць даволі ўдала. Гэта вельмі падабаецца калгасніцам і падымае іх настрой да лепшай работы.

Кожны нумар газэты Клімашэўская выносіць у поле і прачытвае яго калгасніцам.

Па рабоце Клімашэўскай павінна раўняцца ўсё настаўніцтва Полаччыны.

Р. Канавалаў.

Полацкі раён.

Па ініцыятыве Міхневіч Фрузы

Спачатку ўборка ў калгасе „Слабада" ішла надзвычайна дрэнна. Жанчыны не выпрацоўвалі нормы. На работу выходзілі позна і неарганізавана. Першым прыходзілася чакаць па гадзіне і нават больш, пакуль збяруцца ўсе жанчыны. А пачаць работу, не дачакаўшыся ўсіх, ня было зацікаўленасці нават у лепшых ударнікаў, бо рабілі гуртам—цэлай брыгадай. Усім запісвалася аднолькавая норма. У выніку атрымалася, што жнеі, замест нормы ў 0,10 га на дзень, выпрацоўвалі па 0,06—0,08 і менш.

Ударніца—60-цігадовая Міхневіч Фруза, убачыўшы, што пры такой рабоце калгас не скончыць уборкі ў тэрмін, бо аднадзённае заданне выконваецца за $1^1/_2$—2 дні, сабрала групу жанчын і пачала абмяркоўваць, як выйсці з прарыва.

— Чула я,—кажа Фруза,—аб індывідуальнайздзельшчыне. Я думаю паспрабаваць. Калісці я больш зжынала, здаецца і цяпер працую ня горш. Але таму, што працуем агулам выходзіць, што пад старасць і я гультаём стала. Паспрабую я адна жаць, тады ўбачу, ці-то я сапсавалася, ці можа за мае старыя плечы маладыя абібокі хаваюцца.

І Фруза пачала асобна жаць жыта.

Прыгледзілася да яе і Аляхновіч Матруна.—Мабыць і мы возьмем з Фрузы прыклад—кажа яна,—бо так далей нельга цярпець, хутка рагожавы сьцяг нам дадуць за ганебныя тэмпы жніва.

Адна, гледзячы на другую, без удзелу кіраўнікоў, самі перайшлі на індывідуальную здзельшчыну. І старая Міхневіч Фруза, якая выпрацоўвала ўчора 0,08 га, мае сёння—0,20 га, Міхневіч Ф. К.—0,21 га. Яны сыстэматычна бяруць рэкорды па выпрацоўцы норм. Аляхновіч Матруна выпрацоўвае 0,18 га, Міхневіч Анюта—0,16 га, Чыж Наста—0,16 га. Менш дзённай нормы ў 0,10 га ніхто з жанчын не выпрацоўвае.

Толькі дзякуючы ўвядзенню індывідуальнай здзельшчыны калгас нагнаў упушчанае.

8 жніўня, у дзень, вызначаны РК КП(б)Б і РВК, калгас „Слабада" скончыў з поспехам уборку жыта і ячменя і на 50 проц. выканаў збожжапастаўкі дзяржаве.

Крычаўскі раён. Галя.

Гарбадзеяўцы, прымайце выклік

У нашым калгасе—лён самае галоўнае. Улічваючы важнасць уборкі лёну, мы, калгасніцы двух брыгад пасёлку Баброва, бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Выходзіць на работу не пазней 5-ці гадзін раніцы.

Лён абавязкова сартаваць на корані.

Скончыць церабленне лёну 25 га жніўня.

Выклікаем на сацспаборніцтва брыгаду Гарбадзеява.

Ад імя брыгады: Халімоненка Лісавета, Гатоўка Наста, Кавалевіч Параска.

Лепельскі р.

У дапамогу калгасу

Жонкі служачых мястэчка Станіславава арганізавалі два суботнікі ў калгасе „Дуброва", Змітроўскага сельсавета, па дапамозе ва ўборцы ўраджаю. На першым суботніку працавала 19 жанчын, а на другім—15.

Працавалі жанчыны вельмі добра—жалі, вязалі за касцамі, а ў абедзены перапынак выпускалі брыгадныя насценгазеты. Гэта падымала настрой у калгаснікаў, якія засталіся задаволенымі работай жанчын.

Расонскі р. Ганчароў.

1) Докіш Параска, 2) Докіш Фёкла, 3) Каваленка Настя, 4) Каваленка Танна.

Заўтрашнія калгасніцы

Вёска „Новае Лядна“ прыгожа прытулілася пад узгоркам між двух вялікіх вазёр, якія ў час восенскіх ветраў нагадваюць бурлівае мора. Вёска ў асноўным калгасная, але яшчэ засталося шэсць аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Аднаасобнікі тут вызначаюцца сваёй добрасумленнай работай і не менш добрасумленнымі адносінамі да выканання абавязкаў перад дзяржавай.

— Самае галоўнае—гэта не быць даўжніком у дзяржавы,— кажа цётка Параска Докіш. Калі я размяркоўваю свой гаспадарчы прыбытак—што прадаць, што купіць, то на першым плане—выкананне абавязкаў перад дзяржавай, а пасля ўжо сабе.

Аднаасобніца Параска мае 3 га зямлі. Яна пасеяла жыта, ячмень, авёс, лён і іншыя культуры. Яшчэ 21 жніўня цётка Параска выканала гадавое заданне па здачы азімых.

Яна здала 84 кгр. чыстага, сухога жыта. Тры разы веяла, на посцілках сушыла, але-ж затое ніводнага кілаграма ні па засмечанасці, ні па вільготнасці на прыёмачным пункце не збракавалі. Прывезла 84 кгр. і прынялі 84.

Далі ёй у прэмію за добрую якасць збожжа мануфактуры і табакі.

— Падатку нам налічылі 30 р. І гэта амаль выплаціла. Прадала крыху агуркоў, яек, таго-сяго, ды ўжо і выплаціла 23 руб. Засталося толькі 7,—дадае цётка Параска.

Каваленка Настя ўжо мае больш за 50 год. Але яна не дрэнна разбіраецца ў палітыцы. Ведае, што першачарговае выкананне дзяржаўных абавязкаў—гонар кожнага працоўнага аднаасобніка.

На 27 жніўня Настя выканала гадавы план па жыту ў колькасці 82 кгр, а таксама заплаціла падатак у 37 рублёў.

Ад іх не адстала і Фёкла Докіш. Яна заўсёды падштурхоўвала свайго чалавека Сцяпана, каб той як мага хутчэй здаваў. Бо як-жа-ж яна адстане. Ёй нават сорамна сярод іншых, яна-ж толькі адна пісьменная сярод усіх аднаасобніц, Яна ім і прачытае, растлумачыць, калі што не зразумела і калі трэба, то заўсёды дапаможа распісацца сваім таварышкам. Яна не адстала—82 кгр. жыта здала поўнасцю.

Падатка 26 руб. яшчэ не выплачана. Але ў нядзелю Фёкла занясе на рынак гародніны і яшчэ чаго-небудзь і збярэ гэтых некалькі рублёў.

Каваленка Ганна ўжо таксама немаладая. Але больш за ўсіх яна сама завіхалася каля збожжа, якое трэба было здаваць.

— Паверыце, зярнятка да зярнятка падбірала. Хацелася, каб самае лепшае здаць. Сама веяла, малаціла, сушыла. Гадавы план у 84 кгр. выканала поўнасцю.

Віцкая Галена вельмі падганяла свайго Ульяна, каб хутчэй здаваў збожжа. Бо навошта трымаць дзяржаўнае.

Сённяшнія аднаасобнікі вёскі „Новае Лядна“ рыхтуюцца стаць калгаснікамі. Сена касілі, сушылі і зграбалі ўсе 6 гаспадарак разам. І першыя вазы лепшага, дабраякаснага сена пашлі проста з сенажаці на здатачны пункт. Каля двух тон здалі сена і нават квітанцыю агульную выпісалі. Лён аднаасобнікі пасеялі таксама разам. Асабліва рыхтуюцца ў калгас жанчыны—аднаасобніцы. Дамо ім самім слова. Цётка Параска склала на грудзі рукі і папрасіла ўвагі:

— Мы аднаасобніцы вёскі „Новае Лядна“ зараз ужо працуем амаль калгасам. Нашы мужчыны касілі разам сенажаць, а мы згрэблі сена і разам-жа адвезлі дзяржаве. Лён таксама пасеялі разам. Так-што, памаленьку прызвычайваемся да калектыўнай працы. Калгас „Зарава“, у нас пад бокам, да апошняга часу працаваў не вельмі добра. Але сёлета праца наладжваецца. Я аднаасобніца Параска Докіш, як толькі падаспее ячмень з аўсом—выканаю да чыста абавязкі перад дзяржавай, засыплю насенне і буду раіцца з сваім Хведарам, каб уступіць у калгас. Вось і ўсё.

Не адстаюць аднаасобнікі і ў падпісцы на пазыку. Кожны з іх падпісаўся на 40 руб. і ўжо выплацілі па 20—25 руб. Зараз аднаасобнікі пераключыліся на ўборку яравых, якія крыху запазніліся з прычыны позняй сяўбы. Хутка пачнецца абмалот.

Аднаасобніцы вёскі Лядна выклікалі на соцспаборніцтва ўсіх аднаасобніц Лепельскага сельсавета на датэрміновае выкананне абавязкаў перад дзяржавай і па яравых.

Перадавыя аднаасобніцы—заўтрашнія калгасніцы—бязумоўна, справяцца і з гэтай задачай.

М.

Лепельскі раён.

Разлічымся з дзяржавай—ды ў калгас

— Я аднаасобніца, Докіш Фёкла ўжо здала дзяржаве 82 кгр. жыта—выканала гадавы план пастаўкі жыта дзяржаве. Мне трэба яшчэ выканаць 5 пудоў і 10 фунтаў ячменя, 2 пуды і 10 фунтаў аўса, 60 пудоў бульбы і заплаціць 26 руб. падатка. Хутка я разлічуся з дзяржавай, засыплю насенны фонд і буду ўступаць у калгас.

Аднаасобніца вёскі „Новае Лядна“ Докіш Фёкла.

Лепельскі раён.

Больш клясавай пільнасьці, шырэй разгарнуць самакрытыку

„Чыстка праходзіць ва ўмовах жорсткай класавай барацьбы. На цяперашнім этапе яна прымае ўтончаныя формы. Класавы вораг разумее ролю партыі ў гэтай барацьбе. Таму класава-варожыя элемэнты, пралезшыя ў нашы рады, каб з сярэдзіны шкодзіць, аказваюць шалёнае супраціўленне паспяховаму правядзенню чысткі“ (Лычоў).

Бабруйскай камісіяй па чыстцы партыі выкрыт рад фактаў змовы супраць чысткі партыі з боку кіраўнікоў ячэек больніцы і дыспансера горада Бабруйску ў асобе сакратара ячэйкі дыспансера Окуня, члена бюро ячэйкі—ёнжа загадчык райздрава Гершовіча.

Рознымі агіднымі мэтадамі вядуць гэтыя ворагі партыі сваю барацьбу супроць партыі. Адсутнасьць класавай пільнасьці, а таксама крытыкі і самакрытыкі ў партарганізацыі медсанпрацы, дала магчымасьць групе ворагаў развальваць работу лекавых устаноў і шляхам запалохвання, подкупу і „апрацоўкі“ розных гнілых і разлажыўшыхся элемэнтаў стварыць сабе групу абаронцаў у час чысткі.

Раённай камісіяй па чыстцы партыі Окунь і Гершовіч з партыі выключаны. На аб'яднаным паседжанні раённай камісіі па чыстцы, бюро райкома і прэзыдыуму кантрольнай камісіі прынята рашэньне аб паўторнай чыстцы гэтых ячэек. Гэтыя рашэнні зацверджаны рэспубліканскай камісіяй па чыстцы, якая ў сваёй разгорнутай пастанове мабілізуе ўсю партарганізацыю на большую пільнасць, разгортванне крытыкі і самакрытыкі, на выяўленне ўсіх тых, хто зацікае самакрытыку, на выяўленне пераджэнцаў, двурушнікаў, якія зрываюць мерапрыемствы і выкананне задач партыі і ўраду. Бабруйскія факты не адзіныя, аб гэтым гаворыць і выкрыты на фабрыцы „КІМ“ факт саботажа чысткі партыі з боку старшыні фабкома Кашніковай.

Аб адсутнасці бальшавіцкай самакрытыкі, наяўнасьці фактаў сямейнасці і групаўшчыны ў ячэйцы Дзяржвыдавецтва адзначыла гарадская камісія па чыстцы, спыніўшы з прычыны гэтага чыстку ячэйкі.

У час чысткі выяўлены таксама і класавыя ворагі, якія пад фальшыва-нацыянальным сцягам праводзяць сваю контррэвалюцыйную работу.

Старшыня ЦКК РСІ і член рэспубліканскай камісіі па чыстцы партыі тав. Лычоў у сваім артыкуле ў газеце „Звязда“ „Мацней агонь па вылазках класавага ворага“ ўскрывае цэлае гняздо яўрэйскіх шавіністаў, быўшых гандляроў, эксплоататараў, сіяністаў, якія абманным шляхам прабраліся ў партыю і пачалі гаспадарыць у арцелі швейнікаў і спажывецкай кааперацыі, не дапускаючы беларусаў і прапоўных яўрэяў на лепшыя кваліфікаваныя работы.

Чыстка партыі, якая ачышчае яе ад усіх чужых прымазаўшыхся элемэнтаў, узмацняе партыю, робіць яе больш моцнай, баяздольнай.

Выкрытыя ў час чысткі факты патрабуюць ад усёй партарганізацыі, ад усіх рабочых, работніц, калгасніц і працоўных аднаасобніц аказаць камісіям па чыстцы максімальную дапамогу ў выкрыцьці ворагаў. Актыўна ўдзельнічаць у чыстцы, разгарнуць шырокую крытыку і самакрытыку ўсіх недахопаў у рабоце.

Выкрылі сабатажнікаў чысткі ворагаў партыі

Чыстка партыі на фабрыцы „КІМ“ (Віцебск) дапамагала высветліць сапраўдныя прычыны таго глыбокага прарыву, ў якім знаходзіцца фабрыка, выявіць сапраўдны твар яе апартуністычных горакіраўнікоў, якія, схаваўшыся за партбілетам, агідна ігнаравалі выкананне важнейшых дырэктыў партыі.

Фабрыка сістэматычна не выконвала прамфінплана (76—80 %), было вялікае адхіленне ад гатунковасці і вялікі процант перафарбоўкі (12—13 проц.), павялічэнне сабекошту прадукцыі на 2,5 проц., штодзённы перавыдатак пражы на 255 кгр. Рабочы калектыў быў засмечан класава-чужымі элемэнтамі. Камуністка Кавалеўская ў час вярбоўкі рабочай сілы на фабрыку завербавала 4 кулачак, якія пасьля абакралі фабрыку на 700 рублёў. За 1932—33 год на фабрыцы было ўкрадзена 3350 пар панчох, частка з якіх была знойдзена ў кулачак Купцэвіч, Канавалавай і інш., а частка на рынку. Кражам спрыялі дрэнна пастаўлены ўлік і дрэнная ахова грамадскай уласнасці.

Т. Ганчарык, сакратар яч-кі карамельнага цэха ф кі „Комунарка“ праводзіць гутарку з актывам аб падпісцы на заём.

Такія-ж беспарадкі пануюць і на прыгараднай гаспадарцы, дзе здзельшчына ня ўведзена і пануе падзёншчына.

Сакратар парткалектыва тав. Баскін і тав. Кобрына (другі вызвалены работнік бюро парткалектыва) зацікалі самакрытыку, не зварачвалі ўвагі на ўсе гэтыя агіднейшыя з'явішчы на фабрыцы, не гледзячы на тое, што былі сігналы работніц і рабочых.

Калі беспартыйная работніца прыходзіла да Баскіна па якімнебудзь пытаньні, ён яе выпраўляў з габінэта, кажучы: „ідзеце да старшыні фабкома Кашнікавай, я ад беспартыйных заяў не прымаю“.

Пры такім бюро парткалектыва і группарторгі былі падабраны ня лепшыя. У часе чысткі калектыва з 8 группарторгаў 2 выключаны з партыі, як пераджэнцы і за захаваньне свайго сацыяльнага паходжання, 2 праведзены ў кандыдаты і 1 ў спачуваючыя.

Партвучоба ў калектыве была зусім правалена. Кобрына імкнулася замазаць сваю віну ў гэтым, спасылаючыся на тое, што ГК КП(б)Б ня даў кіраўнікоў. Аднак, у час чысткі высветлілася, што на самой фабрыцы „КІМ“ ёсць рабочыя-комуністы, якія добра могуць кіраваць партвучобай.

Абураючы факт быў выкрыт работніцай фабрыкі Цітовай у час чысткі. Старшыня фабкома фабрыкі Кашнікова (член партыі з 1931 года), якая апартуністычна праваліла работу фабкома, зжылася з клясава-чужымі элемэнтамі, хацела ўвесьці ў заблуджэнне камісію па чыстцы. Напярэдадні чысткі яна арганізавала подкуп работніц (выдала ім па 10 руб. беззваротна, талоны на абед і абяцала даць ім кватэру) для таго, каб яны выступілі на сходзе па чыстцы ў абарону яе. Але якраз гэтыя работніцы і выкрылі яе.

Перараджэнка, элемэнт, які яўна разлажыўся, пастановай правяркома выключан з радоў партыі. Выключылі таксама з партыі і дырэктара фабрыкі Фрэйдзіна і сакратара парткалектыва Баскіна і Кобрыну.

Гаркамісія па чыстцы вынесла спецыяльную пастанову аб выкрытым факце сабатажу чысткі партыі на фабрыцы „КІМ“, у якой зацвердзіла пастанову ячэйковага правяркома аб выключэнні Кашнікавай з радоў партыі і аб абмеркаваньні гэтага пытання на масавым сходзе рабочых фабрыкі імя КІМ.

Адначасова гаркамісія адзначыла, што з боку бюро парткалектыва была праяўлена палітычная блізарукасць, недаацэнка гэтага пытання, што сведчыць аб наяўнасці сямейнасці ў парткалектыве фабрыкі. Гэты факт павінен паслужыць урокам для другіх партарганізацый. Ён гаворыць аб неабходнасці большай клясавай пільнасці, большага разгортвання крытыкі і самакрытыкі.

Чыстка парткалектыва фабрыкі „КІМ“ значна аздаравіла яго работу, ударыла па сямейнасці, бястурботнасці і безадказнасці.

Ачысьціўшы свае рады ад усіх чужых і перарадзіўшыхся, парткалектыў фабрыкі „КІМ“, шырока разгарнуўшы партмасавую работу на фабрыцы, зможа дабіцца поўнага выканання ўсіх заданняў, як па колькасці, так і па якасці.

Віцебск.

Брыгада: **Вайнштэйн, Грумбіна.**

На КІМ'е поўны развал масавай работы

На Віцебскай трыкатажнай фабрыцы „КІМ“ ў большасці працуюць жанчыны-работніцы. Асноўная маса іх нядаўна прышла з вёскі, малапісьменная і часта непісьменная. Якую-ж работу праводзіць сярод іх парткалектыў фабрыкі?

Выпрабаванай і даўно ўжо апраўдаўшай сябе формай масавай работы сярод жанчын з'яўляюцца дэлегацкія сходы, якія выпусцілі з сваіх радоў ня мала камуністак, ня мала актывістак соцыялістычнага будаўніцтва.

Але навошта парткалектыву фабрыкі „КІМ“ лішнія турботы, навошта яму дэлегацкія сходы, калі і так усё ідзе „добра“. Прамфінплян на 24/VIII—33 г. выканан толькі на 75,9 проц., фабрыка атрымала па браку 150 тыс. руб. убытку, ёсць вялікая цякучасць рабочай сілы. Пасля водпуску ў адным швэйна-кацельным цэху не звярнулася на работу 75 работніц. У вязальным цэху стаяць 404 дамскіх, 75 дзіцячых і 135 ласычных машын з прычыны недахопу рабочай сілы. Усё гэта не турбуе ні парткалектыў фабрыкі, ні фабком, ні дырэкцыю.

Ніякай масавай работы сярод работніц на фабрыцы не праводзіцца. Ёсць інтэрнат работніц, але ніхто з партыйцаў не прымацован туды для правядзення масавай работы.

Ніякай работы па павышэнні кваліфікацыі работніц таксама не праводзіцца. Сакратар парткалектыва тав. Баскін матывуе гэта тым, што работніцы самі не жадаюць павышаць сваю кваліфікацыю. Яму ў тон уторыць і камуністка Хайкіна — начальнік вязальнага цэху, якая кажа, што работніцы слаба паддаюцца вучобе і старэйшыя майстры ня хочуць іх навучаць. У выніку гэтага сярод 70 манцёраў, якія працуюць у вязальным цэху, ёсць толькі 3 жанчыны.

Ніхто ня кіруе на фабрыцы сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, ніхто не цікавіцца работай гаспадарча-разрахункавых брыгад. З 2500 работніц, якія працуюць на фабрыцы, ёсць толькі 531 ударніца.

Добрай ударніцай з'яўляецца Прудніка ва з матальнага цэху, якая выконвае штодзенна прамфінплян на 120—140 проц.; Расказава—інструктар цэху і жанорг цэх'ячэйкі — таксама дае добрую якасць прадукцыі і выконвае прамфінплан.

Аднэй з самых адсталых на фабрыцы была брыгада № 1 Князявай (матальны цэх). Увесь час брыгада не выконвала прамфінпляна і давала дрэнную якасць прадукцыі.

Калі прыехаў з Масквы намеснік дырэктара тав. Бялоў, ён узяў шэфства над гэтай брыгадай, уступіў у члены брыгады, дапамог арганізаваць штодзеннае сустрэчнае плянаванне, штодзеннае абмеркаванне усіх недахопаў і дасягненняў брыгады. У выніку гэтага, значна палепшылася работа брыгады, няўхільна расце выкананне прамфінплана. Калі 19/VIII брыгада выпрацоўвала 288 кгр. прадукцыі, то 20/VIII выпрацоўка узнялася да 302 кгр., 21/VIII—318. Прамфінплян брыгады—360 кгр.—яшчэ і да гэтага часу ня выканан. Але брыгада з дапамогай тав. Бялова ўпарта змагаецца за яго выкананне.

Ініцыятыву тав. Бялова павінен быў-бы падхапіць трыкутнік фабрыкі, павінен быў-бы перабудаваць сваю работу і работу інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якіх на фабрыцы ёсць 75 чалавек, так, каб кожны непасрэдна працаваў у брыгадзе. Аднак нічога гэтага ня робіцца.

Уся работа на фабрыцы „КІМ“ павінна быць карэнным чынам перабудавана па-новаму паводле апошніх пастаноў партыі.

Рабоце сярод работніц неабходна аддаць максімум увагі. Трэба арганізаваць і наладзіць работу дэлегацкіх сходаў, масавую работу ў інтэрнатах, шырока ўцягнуць работніц у тэхвучобу.

Трэба палепшыць работу сталоўкі, якая вельмі дрэнна працуе, абеды зусім дрэннай якасці і вельмі дарагія (адна патрава каштуе 50—75 кап.). Неабходна наладзіць работу нізавога друку.

Віцебск.

Брыгада: **Мэерзон Б., Грумбіна Т.**

ГЦМ Ср.-Аз.

Між лістовых дрэў

Т. Алесін, С. Шуб

Праз гадзіну пасля золаку.

Маленькі ветрык ускалыхнуў купчастае верхавінне дрэў. Зашапталіся між сабой лісткі, паволі расставілі дыямэнтавыя кроплі расы.

Над піянерскім лагерам, што размясціўся ў былым маёнтку пана Ваньковіча, разнёсся мэлядычны гук сыгнала,

Ветлівае сонейка сваімі першымі праменнямі азалаціла рознакаляровыя шарэнгі дзяцей, што стройна, у чырвоных гальштуках, стаялі на лінейцы.

Вось піянерка Ароцкер Сара—жвавая, круглавідая і заўсёды заклапочаная.

Піянэры часамі жартуюць:

— Сара задумала вялікую думку.

Сара ўсміхнецца, а то і зусім не зверне ніякай увагі.

Ароцкер у атрадзе карыстаецца вялікай пашанай. Нават і на штабе пра яе часта гавораць. Сам начальнік лагера Лёва Каменковіч казаў, што Сара адна з лепшых піянерак у лагеры. І запытайце вы пра Сару ў кожнага піянера, вам усе у адзін голас скажуць:

— Ароцкер? Гэта-ж наша лепшая піянерка! Яна — першая ў нас—сказала, каб стварыць зацейніцкую групу. Вось якая Ароцкер!

— Ну, і што-ж, стварылі такую групу?—пытаемся мы.

— Ну, а як-жа,—хорам адказваюць піянеры. Стварылі адну такую групу, а па прыкладу першай у кожным атрадзе пачалі арганізоўвацца групы зацейнікаў.

Раптам прарэзвае паветра голас дзяжурнага па лагеру:

— Піянерыя, зважай!

Усе звярнулі сваю ўвагу ў той бок, адкуль пад сцягамі ішоў начальнік лагера Лёва.

На лінейцы—цішыня, ніводнага шораху.

Лёва прыняў рапарт ад дзяжурнага па лагеру. Потым чырвоны сцяг па высокай жэрдачцы пачаў павольна ўздымацца ўгару...— Лагерны дзень пачаўся.

Пад сонцам.

Пасля смачнага і сытнага снедання піянеры заўсёды разыходзяцца па звеннях і атрадах, дзе разам з старэйшымі таварышамі-кіраўнікамі праводзяць тыя або іншыя заняткі.

У гэты дзень частка піянераў купалася, частка рыхтавалася да фізкультурных спаборніцтваў з піянерскім лагерам Дукоры.

Вось тыя, што купаліся—ужо высыпалі на бераг. Яны ведаюць карысьць загару і таму павыпроставаліся пад сонцам,—загараюць...

Піянер Колька мае 12 гадоў. Ён рослы, шыракаплечы, дасціпны, а разам з гэтым і вялікі жартаўнік. Колька глянуў на свайго таварыша Мішку і засмяяўся:

— Вось як плавае наша Настулька, дык проста хоць пакаціся ад смеху. Выбірае месца не глыбей за костачкі. І плавае там. Апіраецца аб зямлю рукамі і нагамі. Ну як-раз, як тая жаба, што я аднойчы лавіў на балоце.

Выбухнуў і пакаціўся водгуллем вясёлы смех.

— А ты то ўжо надта лепш плаваеш,—падаў свой голас Левін Давідка, што ляжаў з боку ў Колькі.

— Ого ён,—умяшаўся Барыс,—калі плыве, дык, як карабель, а-ж хвалі на бераг выскакваюць.

Раптам іх спрэчкі прарваліся голасам:

— Рабята, паглядзеце, паглядзеце, адкуль у наш лагер з'явіўся такі скакун!

Дзетвара, што ляжала пад сонцам, зьвярнула сваю ўвагу на невялікую групку піянераў, якая, за крокаў 30 ад іх, займалася фізкультурай.

Радасныя, бадзёрыя і загарэлыя ад сонца дзеці жвава пераскаквалі праз напятыя над зямлёю ніткі, бегалі наперагонкі гулялі ў валейбол.

У водблесках чырвані.

Вечар цёмнай коўдраю распаўзаецца па зямлі. Цемра ахутвае высокія белыя будынкі.

На другім паверсе, у маленькім пакойчыку, дзе размясціўся штаб—весела і шумна. Сюды сабраліся ўсе важатыя атрадаў, члены штаба.

Лёву Каменковіча—начальніка лагера—важатыя падрабязна знаёмяць з тым, як яны падрыхтаваліся да сёняшняга кастра.

Пагаварылі. Вырашылі.

Неўзабаве, — пасля вячэры,— выбухнула полымя кастра, яркія праменні яго далёка распаўзаліся ў цемры і афарбоўвалі сваёю чырванню густую ноч.

Вакол кастра размясціліся піянеры. Разносіліся галасы ад звонкіх спеваў.

Кожны атрад стараецца лепш праспяваць.

Неўзабаве спевы заціхлі. Піянеры 3-га атраду распачынаюць чытку сваёй жывой газеты.

Вось Адуцкевіч Галя, Ліўшыц Соня, Абэзгауз Рыва стаяць у бляску чырвані агню і жывымі вобразамі маляўніча расказваюць, як учора іх атрад працаваў у соўгасе „Серп". Яны гавораць пра лепшых ударнікаў, таксама і пра гультаёў.

Спаборнічаючы паміж сабой,
Два атрады вышлі ў бой.

І гаворачы пра тое, як піянер Міхаська лянаваўся працаваць і ўвесь час бузіў на суботніку, жывая газета заклікае:

Бузацёраў ўсіх падрад,
на буксір вазмі атрад.

За час лагернага збору піянеры адпрацавалі 720 дзён у саўгасе, чым дырэктар саўгасу тав. Казлоўскі і ўсе рабочыя засталіся надзвычайна задаволены.

У перамешку з вуснымі выступленнямі піянеры праводзяць скокі, калектыўныя дэкламацыі і інш.

Дзеці просяць піянерку Гершанбаум Бэлу, што ў мінулым годзе прыехала з Бэрліну, каб расказала, як жывуць піянеры там, у Нямеччыне, у гэтай краіне чорнай фашысцкай рэакцыі.

Бэла—рослая, тонкая, 14 гадовая дзяўчынка, падыходзіць да агню. Яна адчувае сябе неяк нясмела.

Маладыя позіркі дзяцей пранізваюць кожны рух Бэлы.

Бэла пачала расказваць.

У чацвертым піянератрадзе Берліна.

— Мне вельмі ўрэзаўся у памяць 1931 год. Летам наш атрад паехаў у лагеры, ва ўрочышча „Затвінка", што ляжыць у 15 кіламетрах ад Берліна.

У лагеры, нас—дзяцей бяднейшых рабочых, накіравалі арганізацыі „Рот-Фронт" і „Міжрабпом".

У лагеры мы вывучалі гісторыю піянерскага руху. Нам расказвалі, чаму галадаюць беспрацоўныя Берліна, чаму добра жывецца рабочым у Саюзе Саветаў.

І аднаго разу, — гэта было 15 жніўня 1931 году, калі мы ляагню наладжвалі гульні—пачуліся сярдзітыя выгукі мужчын. Гэта былі паліцэйскія—шуцманы. Яны хацелі разагнаць наш лагер. Аднак, ім зрабіць гэтага не ўдалося.

Арганізацыя „Рот Фронт", якая складалася з нашых старэйшых братоў і бацькоў, паліцэйскі налёт адбіла. Але пасьля за гэта, бязумоўна, многія атрымалі розныя кары. Пачалася траўля гарадской буржуазіяй сем'яў, у якіх былі піянеры. Наша сям'я вымушана была пераехаць у СССР.

Грынберг Ліля з Гарт-Форду

Гарт-Форд,—горад у Амерыцы, знаходзіцца ў 120 кіламетрах ад Нью-Ёрку.

Да 1932 г. Ліля жыла ў Гарт-Фордзе. Бацька яе там працаваў рабочым-бляшанікам.

Ліля падышла бліжэй да агню і пачала расказваць пра тое, як абыходзяцца з дзецьмі амерыканскіх рабочых у буржуазных школах.

— З дзецьмі рабочых абыходзяцца вельмі сурова, хоць яны найчасцей бываюць больш здольнымі ў навучаньні за распешчаных дзяцей багатых бацькоў.

— Я добра памятаю,—гаворыць Ліля,—калі маіх таварышоў па вучобе Аўпэрта Гэдэн і Дэаніла (іх бацькі рабочыя-бляшанікі) настаўнік збіў лінейкай за тое, што яны прышлі ў клас з чырвонымі гальштукамі на шыі.

Вось што сказала Ліля пра свой атрад:

— Мы атрымоўвалі даручэнні ад комсамола—разносіць па рабочых кварталах комуністычныя лістоўкі—пракламацыі. Такіх прокламацый мы разносілі шмат.

— Нашы піянеры ездзілі ў лагеры. У 1929 годзе наш лагер быў у мясцовасці „Смавылэйч"—у 80 кіламетрах ад Гарт-Форда і 40 кіламетраў ад Нью-Ёрку. Але не паспелі мы яшчэ як належыць разгарнуць сваю работу, як лагер быў разагнаны палісменамі.

Чырвоны лагерны сцяг быў зняты паліцыяй. Начальніка лагера—улюбёнага нашага таварыша, комсамольца Луіза Этмана—арыштавалі, а пасля пасадзілі ў турму. Калі-ж піянер Гары Гельм запытаў: „Чаму вы арыштавалі нашага Луіза", то гэтыя прадажныя палісмены знялі чырвоны гальштук у Гары і таксама забралі яго ў турму...

Кожнае слова Бэлы і Лілі добра запамяталі піянеры. Іх словы засталіся жывымі вобразамі таго, як жывецца дзецям у нас—у краіне Саветаў, дзе квітнее залатымі пожнямі соцыялістычнае будаўніцтва і там, у краінах капіталу, дзе чорнай зданню блукаюць цені галоднай смерці па рабочых кварталах, дзе люты крызіс канчаткова раздзірае капіталістычнае нутро.

Касцёр павольна дагараў. Рэхам адклікаўся адбой.

Піянеры разыходзіліся спаць.

Першынство за піянерлагерам Лёвы Каменковіча.

Піянерскі лягер у Смілавічах з'яўляецца адным з большых лагераў у Саюзе. Адна змена лагера налічвае 3:0 дзяцей.

У выніку ўмелага кіраўніцтва гэты лагер па сваёй палітвыхаваўчай рабоце, па арганізацыі здаровага адпачынку, па падрыхтоўцы дзяцей да навучальнага году--лічыцца адным з лепшых лагераў Беларусі. І сапраўды:

— Я,—кажа піянер Каждан з 2-га атраду — у лагерах добра адпачыў і правіўся. Прыбыў за месяц на 3½ клгр. Тое-ж самае гавораць піянеркі Гольдзіна, Касынская, з абутковай базы і шмат іншых. Яны таксама добра адпачылі, добра падрыхтаваліся да навучальнага году. Усе яны паправі-ліся на 2—3—4 клгр.

За дзве змены 652 піянера паспяхова прашлі курсы Чырвонага крыжа, якімі, да рэчы, ня дрэнна кіравала студэнтка мед-інстытута Маня Гутэрман. Дзеці добра засвоілі мінімум ведаў у аказанні першай дапамогі. 506 піянераў атрымалі атэстаты, 90 піянераў выпушчаны начальнікамі санітарных пастоў.

У фізкультурных спаборніцтвах з Дукорскім лагерам першынство засталося за лагерам Смілавіцкім, за лагерам, якім кіраваў здольны піянерскі работнік Лёва Каменковіч.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Лагерам выпушчана 51 насценная газета. Праведзена два ваенных паходы, якія прашлі пры ўсіх дапаможна - тэхнічных сродках: тэлефон, азбука Морзэ, розныя ракеты і г. д.

Шугай, піянерская бадзёрасць

Хутка адшалясцелі залатыя жнівенскія дні. Дзеці акунуліся ў будні новага навучальнага году.

Зашугала піянерская бадзёрасьць на штурмах вучобы. Для гэтага дзетвара добра падрыхтавалася, адпачыла, набралася новых сіл і бадзёрасьці ў сваіх піянерскіх лагерах,—між развесістых лістовых дрэў, што купчастым сваім верхавіннем упрыгожваюць лагер.

Шугай, піянерская бадзёрасць!



Дзеці калгасу III Інтэрнац. Клімавіцкага раёну збіраюць каласы пасля жніва.

Вопыт шэфства старых работніц над новымі павінен быць пашыран

МЮД узняў актыўнасць комсамольцаў „Дзвіны“

Комсамольская арганізацыя фабрыкі „Дзвіна“ налічвае ў сваіх радох 300 комсамольцаў, 95 пр. з іх дзяўчаты, якія ў большасці нядаўна прышлі з вёскі.

У час падрыхтоўкі да святкавання XIX МЮД'а быў дан значны штуршок справе шэфства старых работніц над новымі, што грае вялікую ролю ў справе перавыхавання новых работніц і павышэння іх кваліфікацыі.

Была праведзена канфэрэнцыя рабочай моладзі з удзелам старых работніц, на якой т. Старыкова лепшая ўдарніца, старая работніца фабрыкі ўзяла шэфства над маладзёжным вучасткам у барацьбе за выкананне колькасных і якасных паказчыкаў прамфінплана. На канфэрэнцыі адзначылі лепшых маладых ударніц: тав. Нікалаенка—комсамолка з матальнага цэху, свой прамфінплан выконвае на 120—131 пр., тав. Іофэ—сакратар комсамольскай ячэйкі групы В—выконвае свой прамфінплан на 120 проц., тав. Сідарава — герой першай пяцігодкі, заўсёды перавыконвае свой прамфінплан. Тут-жа адзначылі і гультаёў, як Галыкіну, якая не глядзіць за сваёй машынай і сістэматычна не выконвае прамфінплана.

Канфэрэнцыя дала значнае паляпшэнне работы і пэўны зрух у выкананні прамфінплана. Калі да канфэрэнцыі прамфінплан выконваўся на 93—95 проц., то ў апошнія дні ён выконваецца на 100—101 проц.

Комсамольскі калектыў, разам з работнікамі па тэхпрапагандзе, арганізаваў 3 тэхгурткі.

З 55 работніц і рабочых ткацкага цэху 48 ахоплена індывідуальным спаборніцтвам.

Шмат яшчэ ёсць недахопаў на фабрыцы. Дрэнна пастаўлена справа з гаспадарчым разрахункам, з рэалізацыяй рабочых прапаноў, з вынаходствам.

Лёгкая кавалерыя выявіла за апошнія дні 33 прынятых БРЫЗ'ам рабочыя прапановы, якія не праводзяцца ў жыццё. Мала ўвагі аддаецца інтэрнатам. Праўда, іх нядаўна пабялілі, абсталявалі. Аднак, культурная работа яшчэ слаба праводзіцца.

У час падрыхтоўкі і правядзення МЮД'а комсамольскі калектыў фабрыкі быў мабілізаваны на тое, каб знішчыць усе недахопы, якія яшчэ ёсць на фабрыцы.

Сакратар комсамольскага к—тыву ф-кі „Дзвіна“

Віцебск. **Малева.**

За ўшчыльненне рабочага дня

36 год працую я работніцай—ткачыхай, з 1929 года маю ўдарную кніжку, прэміявана тры разы, адзін раз плывучым домам адпачынку.

У нас норма выпрацоўкі за 7 гадзін—39 метраў тканіны. Я выпрацоўваю ня менш 45 метраў, а бывае, калі добрая аснова, то і больш—50—60 метраў. Як стану ля варштата, то да самага абедзеннага перапынку працую без усялякіх адлучак, ганьбую тых, якія пачынаюць разводзіць гутаркі ў час работы.

У мінулым годзе я навучыла 50 новых работніц ткацтву. Бяру на сябе абавязак сачыць на сваім цэху за выкананнем прамфінплана і якасцю прадукцыі і адначасова сачыць за ўшчыльненнем рабочага часу—ня траціць дарма ніводнай секунды.

Я маю грамадскую нагрузку па больніцы. Назіраю, як абслугоўваюцца работніцы. Цяпер я абвяшчаю сябе ўдарніцай часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі“ і абяцаю ўцягнуць у рабкораўскую армію другіх новых работніц—ткачых.

Ярочкіна.

Віцебск, фабрыка „Дзвіна“

Лісты работніц і калгасніц

ТРЫКУТНІК НЕ РЭАГУЕ НА НЕДАХОПЫ

(Ліст работніцы)

У цэхох фабрыкі „Чырвоны тэкстыльшчык“ вельмі брудна, работніцы працуюць у брудных халатах, прыбіральня таксама ўбіраецца неакуратна.

Неаднаразова аб гэтым пісалася ў насценгазеце, але трыкутнік фабрыкі не рэагуе на допісы.

Такое антысанітарнае становішча, бязумоўна, уплывае на выкананне прамфінплана.

Яшчэ адзін факт. Мэханікі дрэнна адносяцца да работы па рамонту машынак. І на гэта трыкутнік таксама не рэагуе.

Менск. **Рабкорка.**

Жанорг Хмялеўская—ігнаруе жанработу

(Ліст калгасніцы - камуністкі).

У нашым калгасе „Авангард“ калісці ня дрэнна працаваў дэлегацкі сход. Але вось ужо цэлы год, як гэта праца закінута і ёю ніхто не цікавіцца.

Парт'ячэйка і ў прыватнасці сакратар партячэйкі тав. Баграцоў недаацэньваюць работы з жанчынамі і лічаць яе другарадной справай. А работы — непачаты край. Здавалася-б, што работа павінна была ісці добра, бо ёсьць-жа ў калгасе парт'ячэйка. Але нават і жанорг РК КП(б)Б—Хмялеўская, якая ў нас працавала каля 2-х месяцаў, ніколі не праводзіла дэлегацкага сходу, колькі ёй не гаварылі аб гэтым.

Я-ж сама цікаўлюся жанработай, але ня ведаю адкуль пачаць, а дапамогі мне няма ніякай. Можа часопісь „Работніца і калгасніца Беларусі“ дапаможа мне ў гэтым.

Калгасніца **Андрэява.**

Лепельскі раён.

Тэхнічныя сродкі аховы

(працяг)

Скарыстанне сродкаў індывідуальнай аховы

У ранейшых артыкулах мы азнаёміліся выключна з пабудовай супрацьгазу, камбінізонам і іншымі сродкамі аховы.

У гэтым артыкуле мы разгледзім, як скарыстоўваць супрацьгаз і камбінізон для аховы сябе ад атрутных матэрый, а таксама і мэтады трэніроўкі.

Раней чым гаварыць аб мэтадах скарыстання супрацьгазаў, спынімся на правілах захавання яго. Трэба памятаць, што супрацьгаз з'яўляецца вельмі крухкім прыборам, таму і патрабуе належнага догляду за сабой.

Ніколі нельга рабіць рэзкіх штуршкоў або стукаць, ад чаго псуецца каробка. Ня трэба дапушчаць таго, каб пасля ўжывання супрацьгаза на ім заставалася вільгаць. Ад вільгаці на каробцы з'яўляецца іржа, якая разбурае мэталёвыя часткі супрацьгаза. Нельга захоўваць супрацьгаз у занадта высокай тэмпературы, ад якой ён псуецца, расцягваецца гума шлему, трацячы сваю моц і пры надзяванні разрываецца на часткі. Таксама ня трэба дапускаць таго, каб супрацьгаз захоўваўся і пры нізкай тэмпературы. Кожны працоўны павінен захоўваць супрацьгаз у сухім кутку, на які не падаюць роўныя сонечныя праменні. Шкодна, калі месца захавання супрацьгаза будзе блізка ад печы, бо пры паленні ствараецца высокая тэмпература, ад якой псуюцца гумавыя часткі супрацьгазу.

Галоўнай задачай кожнага працоўнага з'яўляецца тое, каб правільна навучыцца насіць супрацьгаз, хутка і правільна адзяваць яго, у якіх-бы та ні было абставінах, навучыцца правільна дыхаць ў супрацьгазе, ад чаго залежыць колькі часу мы здолеем у ім прабыць. Акрамя гэтага трэба навучыцца карыстацца і няспраўным супрацьгазам у атручанай атмасферы.

Пры правядзенні трэніроўкі па найбольшым прабыванні ў супрацьгазе, трэба пачынаць з малага часу. Так, напрыклад, у першы дзень—10 хвілін пры спакойным стане, павялічваючы гэту норму з кожным днём. Пры павялічэнні нормы прабывання ў супрацьгазе, вялікую ўвагу трэба звярнуць на правільнасць дыхання. Ня трэба вельмі часта дыхаць. Дыханне павінна быць роўнае і павольнае—прыблізна 10—15 удохаў у хвіліну. Лепш пры гэтым дыхаць праз нос.

У час трэніроўкі з супрацьгазам трэба навучыцца і затрымліваць дыханне, каб пры няспраўнасьці супрацьгазу яго можна было перамяніць на добры супрацьгаз.

Правядзенне правільнай трэніроўкі ў супрацьгазе дасць магчымасць працоўнаму ў час хімічнага нападу не спыняць сваёй работы, працаваць без усялякіх цяжкасцяй у супрацьгазе, як і без яго, што будзе мець вялікае значэнне.

Карыстанне ахоўнай вопраткай.

Раней чым пачаць трэніроўку на лепшае і хутчэйшае адзяванне камбінізона, трэба падабраць касцюм па ўзросту. Адзяецца камбінізон так. Спачатку скідаюцца боты і верхняя вопратка. Пасьля гэтага трэба ўзяць абодвума рукамі за ніз бартоў касцюма так, каб верхняя частка касцюма была адагнута назад і леваю рукою трэба адцягнуць ўнутраны нагрудны клапан. Гэта робіцца для таго, каб нагрудны клапан не перашкаджаў хутчэйшаму ўсоўванню ног. Зрабіўшы гэта, трэба нацягнуць да адказу штаны, левую руку ўвесці ў левае рукаво, і нацягнуўшы касцюм, увесці правую руку ў правае рукаво. Пасля касцюм трэба нацягнуць на плечы, левай рукой заправіць нагрудны клапан і зашпіліць з правага боку на грудзях кнопку. Пры нацягванні касцюма на плечы ня трэба прыкладаць шмат сіл, каб не разарваць яго.

Калі ўсё гэта будзе зроблена, трэба правую полу захінуць пад левую, зашпіліць верхні кручок левай палы, завязаць тасемкі і зашпіліць пас.

На руках зашпіляюцца ўнутраныя абшлагі рукавоў, апранаюцца гумавыя боты, наверх якіх завязваюцца адвароты штаноў. Пасля ўсяго гэтага адзяецца супрацьгаз, на які нацягваецца капюшон. Да капюшона прышпіляецца верхні кут унутранага нагруднага клапана, зашпіляецца на кручок гарлавы клапан, адзяваюцца гумавыя рукавіцы, канцы якіх трэба заправіць пад верхнія абшлагі.

Здыманне касцюма робіцца ў адваротнай паслядоўнасці.

Час прабывання ў касцюме трэба пачынаць з 15 хвілін. Агульны час прабывання ў касцюме на вытворчай дэгазацыйнай рабоце не павінен перавышаць паўтары гадзіны, пры тэмпературы да 25°. Калі тэмпература вышэй 25°, то без медычнага дазволу пачынаць працы ў касцюме нельга.

Для атрымання правільных навыкаў у адзяванні і карыстанні ахоўнай вопраткай, кожны завочны гурток, праз свайго кіраўніка, павінен дагаварыцца з Ц. С. Асоавіяхіму аб водпуску касцюмаў і супрацьгазаў для правядзення практычных работ, а таксама трэба падшукаць належнага кіраўніка, які мае вопыт у гэтай рабоце.

А. Маркавец.

Кошт асобнага нумару 10 кап.

Палепшыць якасць грамадскага харчавання

У мінулым нумары нашай часопісі мы пісалі аб тым, якое велізарнае значэнне мае правільнае харчаванне для здароўя і працаздольнасці чалавека. Існуе думка, якая асабліва пашырана сярод сялян, што самая здаровая і самая карысная страва--гэта мясная. Да гародніны сяляне адносяцца з нейкай ганьбою і ня лічаць яе за сапраўдную яду. Гэта вялікая памылка. Бязумоўна, мяса з'яўляецца вельмі спажыўным прадуктам. Але гэта не азначае, што яно павінна быць галоўным прадметам харчаваньня.

Гародніна вельмі карысная для арганізма, яна мае ў сабе шмат спажыўных матэрый. За мяжой даўно ацанілі вялікае значэнне гародніны ў харчаванні чалавека і ўжываюць яе ў вялізарнай колькасці.

У Амэрыцы гародніна ўжываецца прыблізна ў 6—7 разоў больш чым у нас. Там гародніцтва развіта так моцна, што толькі адных кансерваў з гародніны робіцца на сотні мільёнаў даляраў. У Нямеччыне ёсьць вялізарная плошча, якая спэцыяльна адведзена для камунальных агародаў. У нас-жа толькі нядаўна ацанілі вялікае значэнне гародніны і сталі сур'ёзна займацца пытаннямі гародніцтва.

Чаму, іменна, гародніна так патрэбна для нашага арганізма і што яно яму дае?

Для таго, каб гэта зразумець, мы ўспомнім, што для нармальнага харчавання чалавека патрэбны бялкі, тлушчы, угляводы і матэрыі, якія вучоныя назвалі вітамінамі.

Разбярэм, што сабой уяўляе кожны з прадуктаў у паасобку. Цела чалавека амаль на ¾ складаецца з вады. Вада знаходзіцца ва ўсіх харчовых прадуктах. Без вады чалавек ня можа існаваць. Чалавеку лягчэй пераносіць голад, чым смагу. У гародніне вады знаходзіцца шмат.

Найбольш вядомы ўсім бялок—гэта бялок яйка. Бялкі вельмі патрэбны нашаму арганізму таму, што ён, як і кожная машына, зношваецца—траціць свае часткі, у склад якіх ўваходзяць бялкі. Бялкі знаходзяцца ў рыбе, мясе, яйках, тварогу, а таксама і ў гародніне.

Што такое тлушчы—гэта ведае кожны. Тлушчы патрэбны арганізму таму, што яны падтрымліваюць тэмпературу цела.

Вугляводы—гэта матэрыі, якія галоўным чынам знаходзяцца ў раслінных прадуктах. Як прыклады угляводаў можна назваць усім вядомы крахмал і цукар.

Вельмі шмат вугляводаў у гародніне. Угляводы неабходны таму, што даюць сілу для работы чалавеку, таксама як паліва ў машыне дае сілу для яе работы.

У нашым харчовым пайку бялкі, тлушчы і угляводы павінны быць у патрэбнай для арганізма колькасці. Пры гэтым колькасць іх павінна быць розная ў залежнасці ад узросту чалавека, ад яго вагі і выконваемай работы. Чалавек пры цяжкай рабоце павінен атрымліваць больш, чым чалавек, які выконвае лёгкую работу.

Было-б зусім няправільна, калі-б мы абышлі моўчкі значэнне соляй і вітамінаў для жыцця чалавека.

Без соляй чалавек існаваць ня можа. Солі таксама неабходны чалавеку, як гліна і вапна неабходны для пабудовы камяніцы.

Нашы косці складаюцца галоўным чынам з соляй. Солі таксама знаходзяцца і ў крыві. Чалавечае цела заўсёды страчвае солі з выдзяленнем поту і мачы. Гэту страту неабходна пакрыць. Памыляецца той, хто думае, што страту солі можна пакрыць прыбаўленьнем да стравы звычайнай солі.

Па-першае, трэба ведаць, што ў чалавечым арганізме ёсьць розныя солі, як, напрыклад, солі вапны, солі фосфара, солі жалеза і інш. Гэтыя неабходныя солі знаходзяцца ў страўных прадуктах, асабліва іх шмат у гародніне—бульбе, моркве, капусце, у салаце і г. д.

У заключэнне скажам некалькі слоў пра вітаміны.

Вітаміны--слова лацінскае. Віта—значыць жыццё. Вучоныя, даючы такую назву, жадалі гэтым сказаць, што без вітамінаў няма жыцця. Вітаміны адкрыты нядаўна і іх ёсьць некалькі. Вучоныя іх назвалі літарамі альфабэту а, б, ц, д. Дзейнасьць кожнага вітаміна розная.

(Працяг будзе).

Д-р Форштэр.

Выданне ЦК КП(б)Б. **Адк. рэдактар Э. ШАПІРА**

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Злана ў набор 6-IX—33 г. Падпісана да друку 15-IX—33 г.

Друкарня імя Сталіна **Заказ № 2023** **У ліку 10.000 экз. Галоўлітбел № 913**